ШКОДА І КАРЫСЦЬ ХАРЧОВЫХ ДАБАВАК **6**

УЛАДА СЯНЬКОВА ПРА МОДУ НА БЕЛАРУСКАЕ КІНО **8**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

1 ЖНІЎНЯ 2020 г. СУБОТА № 148 (29262)

ЖНІВО НУМАР ПЯЦЬДЗЯСЯТ ПЯЦЬ

Фота БелТА.

Гледзячы на гэтага зухаватага мужчыну, з цяжкасцю паверыш, што яму за семдзесят. А між тым Генадзю ЦВІРКУ ўжо семдзесят тры гады, і як мінімум пяцьдзясят пяць з іх ён працуе ў сельскай гаспадарцы. І сёлета ў яго пяцьдзясят пятае жніво — у полі. Ён дагэтуль працуе ў ААТ «Аграпёманскі» — улетку на камбайне, у іншы час — брыгадзірам на вытворчым участку.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:

«Прыцягненне інвестыцый — традыцыйна адна з найважнейшых задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Сёння ў Беларусі сфарміраваны, у тым ліку на заканадаўчым узроўні, прывабныя ўмовы для інвеставання ў самыя розныя галіны. Ёсць прэферэнцыйныя рэжымы ў залежнасці ад спецыфікі праектаў. Гэта Парк высокіх тэхналогій, Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», свабодныя эканамічныя зоны, асаблівая эканамічная зона «Брэміна-Орша».

КАРАТКА

- Нацыянальны банк чакае запаволення росту цэн і лічыць рэальным выкананне мэты па інфляцыі ў 5 % па выніках 2020 года.
- **У Беларусі выцерабцена больш за палову плошчаў лёну.**
- «Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў у Расію да 14 жніўня.
- **Завод па перапрацоўцы алейных культур адкрыўся ў Віцебскім раёне.**

- Золатавалютныя рэзервы да канца года прагназуюцца на ўзроўні не менш як $7,3 млрд.
- **Самы яркі зарапад можна будзе ўбачыць з 16 да 23 жніўня.**

ISSN 1990 - 763X

Неraўнадушны рэпартаж

АДЗІНОКАЕ ЛЕТА

Як праводзяць найлепшыя месяцы «ковіднага» года дзеці, якія трапілі ў прытулак

Сёлета з-за эпідэміі каранавіруса ў многіх аздараўленчых лагерах забаронена наведванне бацькамі дзяцей. Для некаторых малых гэта стала сапраўднай праблемай, і яны так і не рашыліся на расстанне з мамай і татам.

Але ёсць у нашай краіне дзеці, якія ва ўмовах сусветнай пандэміі ўвогуле пазбаўлены магчымасці бачыць сваіх бацькоў. Па звестках Міністэрства адукацыі, летась каля 14 тысяч беларускіх сем'яў знаходзіліся ў сацыяльна небяспечным становішчы. Дзяцей з такіх сем'яў часова змяшчаюць у прытулкі сацыяльна-педагагічных цэнтраў (СПЦ).

У СПЦ Ленінскага раёна Мінска расказалі, як іх падапечныя праводзяць гэтае лета. Цяпер там 20 дзяцей. З-за каранціну бачыцца з бацькамі нельга, зносіны — толькі анлайн або па тэлефоне, ды па суботах прымаюць ад родных што-небудзь смачнае для малых. Вось толькі бацькі не імкнуцца скарыстацца нават такімі абмежаванымі магчымасцямі. Работнікі прытулку разгубленыя: звычайна атрымліваецца вярнуць у біялагічныя сем'і да 50 працэнтаў дзяцей, якія да іх трапляюць, але гэтым разам пандэмія быццам «ударыла» па бацькоўскіх пачуццях. У выніку любімая дзіцячая пара — лета — праходзіць для малых трывожна.

Калі рассыпаюцца мары

Алёна разумела, што ёй трэба прысутнічаць на гэтым судзе, — ёй ужо споўнілася чатырнаццаць. Заўтра яе маму павінны пазбавіць бацькоўскіх правоў. Ад адной гэтай думкі перахоплівала ў горле... Слёзы зноў і зноў цяклі на ўжо змакрэлую падушку...

СТАР. 10

Захапленне

УЛАСНЫ ЗАМАК

Мастак Сяргей БАНДАРЭНКА больш за пяць гадоў будуе на прысядзібным участку дакладную копію Крэўскага замка

Сяргей БАНДАРЭНКА каля ўласнага замка.

У пачатку XIV стагоддзя вялікі князь Гедымін пачаў будаўніцтва першага ў Вялікім Княстве Літоўскім цалкам мураванага замка каля злучэння рэк Кравянка і Шляхцянка. А ў пачатку XXI стагоддзя, дакладней крыху больш за пяць гадоў таму, пенсіянер са Смаргоні Сяргей Бандарэнка перабраўся ў вёску Чухны пад Крэвам і пачаў будаваць проста пад вокнамі свайго дома дакладную копію Крэўскага замка ў маштабе 1:10. Мы вырашылі спытаць у Сяргея, як ідзе рэалізацыя амбіцыёзнага праекта і навошта яму наогул гэта трэба...

СТАР. 9

СПАЖЫВЕЦКІ БЮДЖЭТ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ

ДЛЯ ПЕНСІЯНЕРАЎ, ДЗЯЦЕЙ І СЯРЭДНЕСТАТЫСТЫЧНЫХ СЕМ'ЯЎ

Амаль палову (49,3 %) вызначанага мінімальнага спажывецкага бюджэту (МСБ) беларуская сям'я з чатырох чалавек траціць на харчаванне. Менш за ўсё (1,3 %) яны выдаткоўваюць на культурна-асветніцкія мерапрыемствы і адпачынак. Мінімальны спажывецкі бюджэт прымяняецца як сацыяльны нарматыў для прагназавання змен узроўню жыцця насельніцтва і ўзмацнення сацыяльнай падтрымкі грамадзян, якія маюць патрэбу ў дапамозе, паведамляецца на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Сярэднедушавыя мінімальныя спажывецкія бюджэты штоквартальна зацвярджаюцца пастановай Мінпрацы ў цэнах апошняга квартала для шасці сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва і двух відаў сем'яў рознага складу.

З 1 жніўня да 31 кастрычніка МСБ для працаздольнага насельніцтва складае 522,13 рубля, а для пенсіянераў — 404,52 рубля. Для дзяцей да трох гадоў прадугледжана 344,25 рубля, ва ўзросце ад трох да шасці гадоў — 447,30 рубля, для малых ад шасці да васямнаццаці — 449,28 рубля.

Сярэднедушавы мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек служыць падставай для вызначэння права беларусаў на атрыманне льготных крэдытаў і субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) ці набыццё жылых памяшканняў. А таксама права грамадзян, якія пастаянна пражываюць і працуюць у населеных пунктах з колькасцю жыхароў да 20 тысяч чалавек, на льготныя крэдыты на капітальны рамонт і рэканструкцыю жылля, будаўніцтва інжынерных сетак, узвядзенне гаспадарчых памяшканняў і збудаванняў, адзначае Мінпрацы.

Акрамя затрат на харчаванне і адпачынак мінімальны спажывецкі бюджэт беларускай сям'і з чатырох чалавек у цэнах на чэрвень уключае таксама аплату жыллёва-камунальных паслуг (8,6 % МСБ); набыццё адзення, абутку і бялізны (18,5 %); выдаткі на бытавыя паслугі, транспарт і сувязь (8,7 %); мэблю і культурна-бытавыя і гаспадарчыя прадметы (8,7 %); на ўзносы і плацяжы прыходзіцца 2,5 % МСБ; на лекі і прадметы санітарыі і гігіены — 2,5 %.

МСБ для сям'і з чатырох чалавек цяпер складае 413 рублёў і 10 капеек, а маладой сям'і з трох чалавек — 446 рублёў і 97 капеек.

Ірына СІДАРОК.

Меркаванні

«ГУЧНА КАЗАЦЬ ПРА ДАСЯГНЕННІ СВАЁЙ КРАІНЫ НЕ СОРАМНА НІКОМУ І НІКОЛІ»

Ірына ДАЎГАЛА, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:

— Шмат можна гаварыць пра дасягненні нашай краіны за апошнія гады, пра тое, як мяняліся мы і нашы запыты і як хутка забываюцца праблемы, калі яны вырашаны.

Вядома, кожная краіна, як і кожны чалавек, ідзе па сваім шляху. Беларусь рухаецца наперад, развіваецца, квітнее. Як карані чалавека — у традыцыях яго сям'і, так карані народа — у яго гісторыі. І Беларусь клапоціцца аб захаванні ўсяго таго, што дорага памяці народнай.

Гучна казаць пра дасягненні сваёй краіны не сорамна нікому і ніколі. У Беларусі больш за пяць з паловай тысяч аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Скептыкі, вядома ж, будуць казаць, што ёсць і тут праблемныя аспекты. Вядома, ёсць. Але чаму не падкрэсліць тое, колькі ўжо зроблена і дасягнута для захавання нашай гісторыі? Многія краіны зайздросцяць беларусам, бо не маюць такой высокай падтрымкі гэтай тэмы менавіта на дзяржаўным узроўні.

Толькі ў Гомельскай вобласці за апошні час новае жыццё падорана шэрагу гісторыка-культурных аб'ектаў. У іх ліку вядомыя на міжнародным узроўні пахавальня і капліца князёў Румянцавых і Паскевічаў у Гомельскім палацава-паркавым ансамблі. Ужо не першы год, хоць рэканструкцыя працягваецца, прымае гасцей сядзіба Козел-Паклеўскіх у Чырвоным Беразе Жлобінскага раёна. Я ўжо не кажу пра іншыя рэгіёны Беларусі: Мірскі, Нясвіжскі, Крэўскі, Любчанскі, Косаўскі, Лідскі замкі... Усё гэта захавалі! І не толькі для нас, беларусаў, але і для новых пакаленняў і для каласальнай колькасці турыстаў, якія з задавальненнем едуць у нашу краіну.

Чыста. Прыгожа. Утульна. Бяспечна... У Беларусі рады ўсім, хто прыйшоў з мірам!

«МЫ Ў СВАЁЙ КРАІНЕ ПРАЦЯГВАЕМ ПРАЦАВАЦЬ, І ГЭТА ДАЗВАЛЯЕ ГЛЯДЗЕЦЬ У БУДУЧЫНЮ З АПТЫМІЗМАМ»

Аляксандр ЯФРЭМАЎ, народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, мастацкі кіраўнік Тэатра-студыі кінаакцёра, рэжысёр тэатра і кіно, сцэнарыст, акцёр:

— Увесь той час, што я знаходжуся ў штаце нацыянальнай кінастудыі (а налета споўніцца ўжо 45 гадоў, як я прыйшоў на «Беларусьфільм», і 30 гадоў, як кірую Тэатрам-студыяй кінаакцёра), я нікуды не сыходзіў, хоць многія людзі мастацтва шукалі лепшай долі ў іншых краінах. І нават здымаючы кіно па заказах маскоўскіх прадзюсараў, усё адно працаваў у Мінску — бо беларускае кіно нават у самыя складаныя перыяды не спынялася. Ніколі не думаў, што буду здымаць фільмы пра вайну, але прыйшоў час, і я зразумеў, што не магу абысціся без таго, каб не зрабіць свой сціплы ўнёсак у гэту тэму. І вось у жніўні на тэлеэкран у эфіры «Беларусь 1» выйдзе мой чатырохсерыйны фільм «Танкіст». Скажу пра асабістыя адчуванні: якія б цяжкія, няпростыя часы не перажывала цяпер мастацтва ў Беларусі і ва ўсім свеце, мы ў сваёй краіне працягваем працаваць, і гэта дазваляе глядзець у будучыню з аптымізмам. Мяркую, што самыя галоўныя карціны і поспехі кінастудыі «Беларусьфільм» яшчэ наперадзе — яны не проста магчымыя, але абавязкова будуць, я веру і перакананы ў гэтым. Пакуль жа мы ў тэатры, засумаваўшы без сваіх гледачоў, вельмі чакаем новых сустрэч!

«ВУЛІЦА» — ГЭТА ШЛЯХ У НІКУДЫ»

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ адзначае імкненне выбаршчыкаў да абмеркавання рэальных праблем:

— За гады незалежнасці Беларусь сапраўды здзейсніла вельмі сур'ёзны рывок наперад у сваім развіцці. Не заўважыць гэта можа толькі невідушчы — таму што развіццё адбылося і па кірунках эканамічных, структурных, інфраструктурных, культурных, спартыўных, у міжнародных адносінах... Змянілася ўсё: краіна сапраўды ўстала на ногі, у ёй з'явіліся традыцыі дзяржаўнасці, суверэнітэту. Мы здолелі кансалідаваць асноўныя грамадзянскія інстытуты нашага грамадства, і сёння можам вельмі ўпэўнена адчуваць сябе на міжнароднай арэне.

Прычым зрабілі мы ўсё гэта не дзякуючы багатым прыродным рэсурсам, а ўласнай працы. Я разумею, што камусьці магло б хацецца большага, а дастатак, напэўна, мог бы быць большы, але гэта тое, чаго мы дасягнулі самі. Гэта вынік нашых сумесных намаганняў. Нам няма каго вінаваціць — як, увогуле, і ўдзячныя мы мусім быць толькі самім сабе.

Сацыяльнае развіццё і сацыяльная згода ў грамадстве дасягаюцца дастаткова складаным і карпатлівым шляхам. Толькі праз дыялог, сістэмную працу — на вуліцах такія рэчы не вырашаюць. Хутчэй, «вуліца» — гэта шлях у нікуды; шлях, які хутчэй за ўсё прывядзе да парушэння дэмакратычных традыцый, якія толькі-толькі пачалі фарміравацца ў Беларусі, да разброду і хістання. І мы можам згубіць усё, што маем.

Мы мусім гаварыць шчыра і сумленна пра ўсё — не толькі аб дасягненнях, але і аб праблемах. Шмат у чым я бачу, дарэчы, па сваіх выбаршчыках, што яны хочуць бачыць абмеркаванні рэальных праблем, бачыць, як і чыноўнікі, і мясцовая ўлада, і грамадскія арганізацыі з гэтым праблемамі спраўляюцца.

Гэта вельмі сур'ёзны запыт грамадства, і без усякага сумнення мы павінны на яго адрэагаваць.

«Я МАРЫЛА ЗРАБІЦЬ ШТО-НЕБУДЗЬ КАРЫСНАЕ ДЛЯ ЗЕМЛЯКОЎ, І ДЗЯРЖАВА МЯНЕ ПАДТРЫМАЛА»

Ганна ШАНДАРУК, дырэктар прыватнага прадпрыемства «Шанц-Парэчча»:

— Чвэрць стагоддзя таму я вырашыла адкрыць свой бізнес у невялікім пасёлку Парэчча Гродзенскага раёна. Першым аб'ектам стала харчовая крама. Без перабольшвання магу сказаць, што ставіла перад сабой задачу падаць самы шырокі асартымент харчовых прадуктаў, якія дагэтуль не траплялі на прылаўкі мясцовай гандлёвай сеткі. І жыхары гэта ацанілі. Таму зрабіла і другі крок — адкрыла прамтаварную краму. А ў хуткім часе — і рэстаран. Новы будынак узведзены ў цэнтры аграгарадка, побач з чыгуначным вакзалам. Дарэчы, менавіта праз Парэчча амаль 160 гадоў таму прайшла першая на Беларусі чыгунка. Да таго ж тут маляўнічыя мясціны, ёсць санаторый «Парэчча». Таму акцэнт зрабіла на турыстаў. Але галоўным чынам імкнулася, каб было зручна мясцовым жыхарам — і вяселле справіць, і юбілей, і іншыя важныя падзеі. Дзеля патрэб месцічаў адкрыла цырульню, дзе працуюць сапраўдныя майстры сваёй справы. І наша паслуга запатрабавана, бо сёння кожны чалавек незалежна ад таго, дзе ён пражывае, імкнецца быць акуратным і выглядаць добра. Лічу, што такая магчымасць у маіх землякоў ёсць.

Вядома, такія крокі было б немагчыма зрабіць без падтрымкі мясцовых уладаў і тых нарматыўных дакументаў, якія прымаюцца на ўзроўні кіраўніцтва краіны. Другі год, як сельскі бізнес вызвалены ад выплаты падатку на дабаўленую вартасць. Значна скарацілася колькасць дакументаў, справаздач, узгадненняў. Гэта дае магчымасць развівацца. А для ахвотных заняцца сваёй справай — пачынаць бізнес.

Я вельмі люблю сваю малую радзіму і ганаруся, гледзячы, як мяняецца яе аблічча. За апошнія гады аграгарадок значна добраўпарадкаваны. Наводзіцца парадак на вуліцах, арганізаваны вываз смецця, самі жыхары сочаць за парадкам, абнаўляюць свае дамы і падворкі. Якраз цяпер вядзецца капітальны рамонт дарогі з Гродна на Парэчча. Гэта таксама надзвычай важна, бо пасажырапаток паміж абласным цэнтрам і аграгарадком вельмі значны. А некаторыя і наогул імкнуцца ўладкавацца ў нашым аграгарадку. Тут можна працаваць у санаторыі, дзвюх школах, кадэцкім вучылішчы, мясцовай гаспадарцы, у іншых установах. Галоўнае — не ленавацца, працаваць, праяўляць ініцыятыву, прадпрымальнасць. І поспех абавязкова прыйдзе...

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне вядучаму бухгалтару Міністэрства інфармацыі Таццяне Міхайлаўне Карняенкавай у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Ведай нашых!

НАЙЛЕПШЫ ПРАЕКТ З МНС

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях узнагародзіла журналістаў, якія асвятляюць дзейнасць беларускіх ратавальнікаў. Цырымонія прайшла ў пятніцу ва Універсітэце грамадзянскай абароны. Пераможцы атрымалі граматы і каштоўныя падарункі. Іх уручыў асабіста міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Вашчанка.

У намінацыі «Найлепшы праект» ганаровае першае месца заняў звяздоўскі цыкл «Жывіце ў бяспецы», які на старонках газеты вядзе Валяр'ян Шкленнік.

— У нашай справе самае галоўнае — гэта не дапускаць інфармацыйнага вакууму, — адзначыў Уладзімір Вашчанка. Калі сёння своечасова не даць аб'ектыўную інфармацыю, то адразу ж пойдуць чуткі, пачнуцца спрэчкі. А пасля давядзецца апраўдвацца. Таму я ўдзячны журналістам за ўзаемадзеянне і аб'ектыўнасць. Канешне, ёсць пэўныя пытанні, якія трэба вырашаць і паляпшаць. Але на прыкладзе нашай службы бачны клопат дзяржавы аб людзях. Ёй зайздросцяць некаторыя калегі з іншых краін. І на сусветных пляцоўках адкрыта выказваецца думка, што ў Беларусі створана адна з наймацнейшых выратавальных службаў свету.

Ул. інф.

Тэхналогіі

ЗАПРАЎКА СА СМАРТФОНА

У краіне запусцілі адзіную мабільную праграму для электрамабілістаў — Malanka. Прыемная навіна: заправіць сваё аўто на электрычнай цязе ўсё яшчэ можна бясплатна. Аб гэтым расказаў намеснік дырэктара «Беларуснафты» Андрэй КОЦІК.

— Зарадка электрамабіляў у нас была бясплатная з 2014 года, пакуль мы працавалі ў тэставым рэжыме. Бясплатны перыяд тэсціравання дадатка будзе захоўвацца яшчэ прыкладна месяц, але ў далейшым кошт 1 кВт на станцыях пастаяннага току (хуткія ЭЗС) складзе 39 капеек, на станцыях пераменнага току (павольных) — 29 капеек. Такі ўзровень тарыфаў найбольш прымальны для нашага рынку, цэны — самыя нізкія ў Еўропе. Гэта павінна стымуляваць аўтамабілістаў да павелічэння «зялёных» аўто ў краіне. Разам з тым мы разглядаем магчымасць адпускаць электраэнергію для зараду па сесіі — да неабходнага ўзроўню зарадкі. На павольных ЭЗС кошт адной сесіі складзе 5,46 рубля, на хуткіх — 7,34 рубля, незалежна ад колькасці адпушчаных кВт у гадзіну.

Андрэй Коцік адзначыў, што разглядаецца варыянт, каб у будучыні аплачваць зарадку электрамабіля можна было толькі з дапамогай мабільнай праграмы. «Бо гэта зручны і сучасны спосаб. Кіроўцу не трэба стаяць у чарзе да аператара, каб аплаціць зарадку, даставаць банкаўскую картку, можна будзе проста скарыстацца смартфонам. Да мабільнай праграмы прывязваецца банкаўская картка ўладальніка, і ў далейшым аплата ажыццяўляецца ў некалькі клікаў. Для нас важна атрымаць зваротную сувязь: магчымасць задаць пытанне, даслаць прапанову ёсць у самой праграме, паглядзець на статыстыку і вызначыць, што лепш для карыстальнікаў: напрыклад, аплачваць электраэнергію па кілаватах або плаціць за адну сесію. Для нас перш за ўсё важны кліент, на яго меркаванне мы і будзем арыентавацца».

Распрацоўкай праграмнага забеспячэння мабільнай праграмы займалася славенская кампанія Etrel. **Інжынер «Беларуснафты» Максім СУСАРЭНКА** расказаў, што праграма дазваляе ўбачыць размяшчэнне ўсіх зарадных станцый краіны, сарыентавацца, ці свабодная патрэбная станцыя ў гэты момант, таксама ў працэсе зарадкі ўладальнік электракара можа адсачыць усе патрэбныя параметры: колькі часу засталося да поўнай зарадкі, якую адлегласць праедзе электрамабіль на астатквым зарадзе і іншае. «Карыстацца праграмай вельмі проста: скачваем з Apple Store або Play Market, рэгіструемся, уводзім характарыстыкі аўтамабіля і зараджаем яго. Грошы спісваюцца па факце завяршэння зарадкі. Дарэчы, у праграмы ёсць розныя раздзелы. Напрыклад, ва ўкладцы «Мой аўтамабіль» прадстаўлены 37 марак аўто: ад BMW і Nissan да Brammo, Tata, Mia і іншых. Для кожнага электракара паказана, якая ёмістасць батарэі, запас ходу, тып раз'ёму і іншыя параметры».

Дар'я ШЛАПАКОВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Польшчы апаганілі помнік Ракасоўскаму

Скульптуру маршала Канстанціна Ракасоўскага выкралі з мемарыяльных могілак у Лягніцы на захадзе Польшчы. Яна была часткай адкрытай экспазіцыі музея, размешчанага на могілках чырвонаармейцаў. Пазней абезгалоўленая скульптура была знойдзена на адной з вуліц Лягніцы. Пасол РФ у Польшчы Сяргей Андрэеў заявіў РІА Навіны, што пасольства патрабуе ад уладаў краіны знайсці і пакараць вінаватых у вандалізме. «Відавочна, што пастаўленае ў Польшчы «на паток» апаганьванне помнікаў савецкім воінам-вызваліцелям напрамую звязана з атмасферай варожасці ў адносінах да СССР і Расіі, якая нагнятаецца намаганнямі ўладаў і вядучых СМІ, кампаніяй па перапісванні і фальсіфікацыі гісторыі ў русафобскім духу, якая даўно стала стрыжнем польскай гістарычнай палітыкі», — гаворыцца ў каментарыі МЗС Расіі, размешчаным на сайце дыпламатычнага ведамства. У МЗС адзначылі, што «польскія ўлады сваіх адносін да брыдкага здарэння публічна да гэтага часу не выказалі».

У Эквадоры забаранілі продаж алкаголю ў выхадныя

Улады Эквадора прынялі рашэнне забараніць продаж алкаголю ў выхадныя на большай частцы тэрыторыі краіны для прадухілення распаўсюджвання каранавіруса ў рэспубліцы, паведамляе ТАСС.

«З 31 ліпеня да 12 жніўня забараняецца продаж алкаголю ў перыяд з пятніцы да нядзелі», — гаворыцца ў паведамленні на сайце мясцовага камітэта па дзеяннях у надзвычайных умовах. Меры будуць дзейнічаць у 18 з 24 правінцый краіны, у шасці з іх будзе таксама больш жорсткі рэжым каменданцкай гадзіны.

Аматар даўніны пазнаў свайго двайніка на стагадовым здымку

Жыхар англійскага горада Стокпарт, графства Вялікі Манчэстэр, выявіў свайго двайніка на здымку, зробленым у 1905 годзе. Пра гэта паведамляе выданне The Mirror.

24-гадовы Майкл Карапіц, захоплены Віктарыянскай эпохай, атрымаў здымак ад сваіх сяброў. Яны даслалі яму фатаграфію, на якой зняты вельмі падобны на яго юнак са сваёй маладой жонкай. «Я быў уражаны, калі зразумеў, што гэта не я. У нас адна і тая ж прычоска, авал твару, форма носа і стыль у вопратцы», — прызнаўся аматар даўніны.

Мужчына доўга шукаў інфармацыю аб здымку ў сеціве і прыйшоў да высновы, што ён сапраўды быў зроблены ў 1905 годзе. «Мяне многія называюць «падарожнікам у часе», а я цяпер і не ведаю, як рэагаваць», — адзначыў брытанец.

Інавацыі

БЕЗ АНІЯКАГА ГІПСУ

Матрыксы для зрошчвання костак стварылі навукоўцы БДУ

Хімікі Белдзяржуніверсітэта ў складзе міжнароднага калектыву працуюць над стварэннем біяраскладальных каркасаў для зрошчвання костак. Склад распрацоўшчыкаў прадстаўлены таксама навукоўцамі з Расіі, Германіі і Ірландыі.

Сёння для артапедыі і хірургіі актуальнай з'яўляецца праблема паскарэння зрастання касцяных тканак пасля цяжкіх пераломаў, прыроджаных паталогій і бягучых артапедычных захворванняў. Калектыў навукоўцаў прапануе на месца пашкоджанага касцявога ўчастка ўжыўляць полілактыдны матрыкс. Гэта аб'ёмная трохмерная порыстая канструкцыя з біяраскладальнага палімеру, якая з дакладнасцю да некалькіх нанаметраў індывідуальна адліваецца пад канкрэтнага пацыента. Форма, памер залежаць ад характару і спецыфікі пашкоджанняў. Матрыкс выконвае падвойную функцыю — апорную і аднаўленчую: з аднаго боку, не патрабуецца гіпсавая фіксацыя, а з другога, адбываецца стымуляванне росту клетак і паскарэнне працэсу загойвання.

Ужыўляюцца матрыксы на месца траўмы хірургічным шляхам. На працягу месяца адбываюцца рэгенерацыя раны і ўтварэнне новых тканак. У далейшым выманне гэтай канструкцыі не патрабуецца, бо яе склад забяспечвае біясумяшчальнасць, раскладальнасць і нетаксічнасць.

У групе міжнароднага калектыву навукоўцы БДУ адказваюць за распрацоўку саставу матрыксаў. Матэрыял для іх вырабляецца з палімера, атрыманага ў НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ.

У цяперашні час навукоўцы правялі даклінічныя выпрабаванні і працуюць над дабаўленнем у матрыкс антыбіётыкаў для зніжэння рызыкі інфіцыравання пры хірургічнай аперацыі.

Пры паспяховай рэалізацыі навуковага праекта інавацыя будзе прапанаваная медыкам для яго далейшай апрабацыі і ўкаранення ў практыку.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Бяспека

Кіберзлачынцы ўкралі 837 тысяч долараў

Іх ахвярамі сталі восем беларускіх банкаў літаральна за тры месяцы мінулага года. Дзейнасць парушальнікаў закона спынілі праваахоўнікі. Пра гэта паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій МУС Уладзімір Зайцаў.

Дзесяць удзельнікаў чатырох міжнародных злачынных груп дзейнічалі з сакавіка да мая 2019 года. Яны «працавалі» на тэрыторыі не толькі Беларусі, але і Расіі, Латвіі, Літвы, Украіны. Яны шукалі падстаўных асоб для рэгістрацыі на свае імёны банкаўскіх і сім-картак і выводзілі наяўныя грошы пры дапамозе банкаматаў. Узнагароджанне тым, хто пагаджаўся на афармленне такой карткі, даходзіла часам да 1 тысячы долараў.

Як жа ім удалося ўкрасці такія вялікія грошы? Гэта растлумачыў следчы па асабліва важных справах аддзела па расследаванні злачынстваў супраць інфармацыйнай бяспекі і незаконнага абароту наркотыкаў упраўлення Следчага камітэта па Мінску Павел Кушнірык.

— Злачынцы выявілі банкаўскую ўразлівасць, якой і скарысталіся. На тэрыторыі Злучаных Штатаў Амерыкі пры дапамозе шкоднаснага праграмнага забеспячэння быў атрыманы доступ да электронных плацежных тэрміналаў, якія былі ўсталяваны ў аб'ектах гандлю і сэрвісу. Пры дапамозе ручнога ўводу злачынцы праз электронныя тэрміналы адпраўлялі ў беларускія банкі запыты па аперацыях вяртання пакупкі. У сваю чаргу, настройкі працэсінгу такія, што банкі Беларусі ў межах вызначаных сум залічалі сродкі на аплатныя карткі, якія пасля выкарыстоўваліся для злачынства. Зламыснікі адразу абнаяўнівалі грошы ў банкаматах, праз сістэму дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання набывалі крыптавалюту і выводзілі яе на падстаўныя рахункі.

Такім чынам, шэсць парушальнікаў закона былі змешчаны пад варту. Супраць іх распачаты крымінальныя справы па ч. 4 арт. 212 Крымінальнага кодэкса (крадзеж грашовых сродкаў шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі). Прычым адзін з затрыманых абвінавачваецца адразу па некалькіх артыкулах. Ён набываў карткі і праз даркнэт рэалізоўваў іх рэквізіты не толькі для здзяйснення гэтага злачынства, але таксама для незаконнага абароту наркатычных сродкаў. Акрамя таго, высветлена яго дачыненне да выкрадання ў «Белпошты» больш за 30 тысяч рублёў, якое было зроблена тры гады таму. Адзін з затрыманых для прыкрыцця карыстаўся несапраўдным пашпартам грамадзяніна Данii. У сваю чаргу, яму інкрымінуецца выкарыстанне падробленых дакументаў.

Канчатковая сума агульнай шкоды розным банкам пакуль невядомая.

— Мы прынялі неадкладныя захады, каб спыніць магчымасць здзяйснення такога віду злачынстваў, — зазначыў Уладзімір Зайцаў. — Так, у Нацбанк быў накіраваны ліст, у якім, сярод іншага, было рэкамендавана выставіць ліміты па такіх аперацыях.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

«ПОЛАЦК — НАВЯДЗЁМ МАСТЫ»

Такую назву маюць праекты па рэалізацыі ідэй устойлівай гарадской мабільнасці да 2040 года ў Полацку і Наваполацку. У літаральным сэнсе план «зялёнага» горадабудаўніцтва «Полацк — навядзём масты» мае на мэце аднавіць масты, наладзіць сувязі раёнаў горада з цэнтрам і паміж сабой. А ў пераносным — усталяваць пераемнасць паміж мінулым і будучым, захаваўшы культурную і прыродную спадчыну для нашчадкаў. Горад хочуць зрабіць яшчэ больш рознабаковым, утульным ды гарманічным з прыродай.

ЭФЕКТ НА МІЛЬЁН

Перспектыўнае бачанне і прыярытэты гарадскога развіцця абапіраюцца на рэалізацыю праспаравай мадэлі «Полацк як архіпелаг самадастатковых пазнавальных раёнаў». У плане «зялёнага» горадабудаўніцтва тут імкнуцца рэалізаваць праспаравую стратэгію ў трох кірунках. Развіць гістарычную частку, умацаваць агульнагарадскі цэнтр і развіць дадатковыя цэнтры на аснове мадэлі транзітна-арыентаванага развіцця. Звязаць паміж сабой раёны і наладзіць мабільнасць без лішніх аўто. Стварыць кліматычна ўстойлівую планіровачную інжынерную інфраструктуру.

Полацк нельга аддзяляць ад Наваполацка, бо яны фактычна ўжо зліліся ў адзін горад. Тут знаходзіцца вялізны прамысловы цэнтр, які дае сур'ёзную экалагічную нагрузку на рэгіён. І хоць нельга паўплываць на нафтавы комплекс, але можна ўздзейнічаць на гарадскі асяродак, мяркуе **Сяргей ЛЕЙЧАНКА, першы намеснік старшыні Полацкага райвыканкама:**

— Мы паказваем жыхарам, што гэта горад новых магчымасцяў. Мы першыя пачалі рабіць веладарожкі на праезнай частцы. Мы гады тры тлумачылі людзям, чаму гэта здорава. Цяпер дарожкамі актыўна карыстаюцца і пытаюцца, як далей будзе развівацца веларух.

У горадзе скрупулёзна падышлі да арганізацыі дарожнага руху. За апошнія тры гады ўжо другі раз перарабілі генеральны план горада з улікам змен, якія ўжо ўкаранілі і якія задумалі на перспектыву.

— Нам патрэбны, у прыватнасці, скрыжаванні без святлафораў, якія не будуць затрымліваць машыны. Будзем рабіць кальцавы рух, як у Еўропе. Збудуем мост з веладарожкай, — падзяліўся намерамі намеснік старшыні. — Гэта мерапрыемствы, якія не патрабуюць вялізных грашовых укладанняў. Вось трэба было вуліцу ўпарадкаваць. Дык мы яе не перараблялі, а размалявалі «за тры капейкі», затое эфект атрымалі «на мільён рублёў».

ТРЫ СЦЭНАРЫІ РАЗВІЦЦЯ ГРАМОЎ

Абмен ведамі паміж праекціроўшчыкамі, якія займаюцца трансфармацыяй прасторы ў межах праграмы ўстойлівага развіцця, і гараджанамі можа адбывацца на вертыкальным і гарызантальным узроўнях. Апошняе — гэта калі жыхары выказваюць разнастайныя на месца, дзе яны жывуць, і тлумачаць, чаго хочуць. Ім патрэбна дамовіцца не толькі паміж сабой, але і з экспертамі, якія глядзяць на гэтую тэрыторыю вачыма прафесіяналаў. Калі ж на такіх сустрэчах прысутнічаюць яшчэ і мясцовыя ўлады, то абмен думкамі і інфармацыяй адбываецца на вертыкальным узроўні, тлумачаць эксперты.

Для раёна Грамы ў Полацку, які знаходзіцца блізка да цэнтра горада, але адрэзаны ад яго чыгункай, спецыялісты кампаніі MLA+ прапанавалі тры сцэнарыі развіцця: турыстычны цэнтр, Полацк-сіці і гарадская вёска.

Першы варыянт базуецца на тым, што тут ёсць пэўныя аб'екты, якія могуць зацікавіць турыстаў. Акрамя таго, акцэнт робіцца на існуючых і будучых спартыўных аб'ектах. Магчымасці вяслярнай базы на рацэ Палата можна выкарыстоўваць, каб ладзіць спускі па ёй, таксама прыцягваючы турыстаў.

У варыянце Полацк-сіці прапанавана перапрафіляваць існуючыя плошчы, каб стварыць пункты прыцягнення, напрыклад закінуты вінзавод. Пры гэтым трэба вырашаць праблему транспарту, бо раён Грамы адрэзаны ад цэнтра горада чыгункай.

— Каб вырашыць гэтае пытанне, самае простае і, напэўна, найбольш эфектыўнае рашэнне — стварыць чаўнок або складсі схему руху мікрааўтобусаў. Яны змогуць курсіраваць па пэўным маршруце і падвозіць жыхароў да месцаў пераходу цераз чыгуначныя шляхі, замест таго каб тут ездзіў грамадскі транспарт, які ходзіць у цэнтр і рызыкуе на 40 хвілін захраснуць на пераездзе, — расказала **ўрбаністка Надзея ЦАРАНОК.**

Паколькі ў Грамах прэваліруе прыватны сектар, разглядаецца таксама трэці варыянт — ператварэнне яго ў гарадскую вёску, якая будзе шматфункцыянальным цэнтрам, сфарміраваным з улікам уважлівага стаўлення да прыродных тэрыторый пры арганізацыі грамадскіх прастор.

АГРАТЭХНАПАРК ЗАМЕСТ ЗАВОДА

Асноўныя прынцыпы, якімі кіраваліся эксперты пры распрацоўцы праекта для Грамоў, — эклектычнасць, уключанасць у гарадскую структуру, структураванасць і здольнасць да будучых змен.

Задумкі для трансфармацыі тут добрыя, і можна рэалізоўваць на практыцы пэўныя прапановы з усіх трох варыянтаў развіцця. Увогуле трансфармацыя павінна праду гледжваць гнуткасць, бо ўсе змяненні — гэта пытанне 10—15 гадоў, а не трох-чатырох. Гэтая якасць дазволіць развівацца ў нагу з часам, бо праз нейкі перыяд папярэднія прапановы экспертаў могуць стаць неактуальнымі і неабходна будзе іх змяніць, перш чым рэалізаваць, адзначылі эксперты.

У Грамах прапануецца, напрыклад, стварыць транспартны мост, які дапаможа аб'яднаць раён з цэнтрам, і зладзіць пешаходныя масты з рампамі і ліфтамі, каб людзям было зручна трапляць у цэнтр Полацка. Пры пераходзе чыгункі ў адным узроўні можна зладзіць велапалосы і тратуары, агараджальныя бар'еры. Такім чынам кожнае перасячэнне чыгункі ператворыцца ў транспартна-перасадачны вузел з прыпынкамі грамадскага транспарту, велапаркоўкамі і перахапляльнымі стаянкамі.

Каманда працавала і над стварэннем структураванай «зялёнай» сеткі грамадскіх прастор і тэрыторый, каб стварыць унутраныя сувязі для аб'яднання Грамоў з горадам.

Цікавыя таксама прапановы арганізацыі разнастайных грамадскіх прастор на базе існуючых аб'ектаў і індустрыяльных плошчаў, якія сёння не выкарыстоўваюцца. Напрыклад, можна стварыць музей чыгункі на тэрыторыі чыгуначнага дэпо, існаванне якога цяпер перашкаджае развіццю Грамоў, калі вывесці яго ў Light-Industrial зону, што ствараецца. А на тым месцы збудаваць сучасны раён сярэднепавярховай забудовы.

Добрая прапанова і па добраўпарадкаванні тэрыторыі каля стадыёна «Лакаматыў» — стварэнне там спартыўнага цэнтра і пляцоўкі для экстрэмальных відаў спорту. На тэрыторыі вінзавода можна арганізаваць адкрытую прастору, а ў цэхах зладзіць офісы і майстэрні, падзейную пляцоўку для выставак, фестываляў, лекцый.

Аўтарамонтны завод можа паспрыяць паляпшэнню іміджу раёна, калі пасля прыцягнення інвестыцый гэтае месца стане аграпаркам — унікальным цэнтрам навукі і практыкі. Пасля рэкультывацыі тэрыторый можна атрымліваць на іх ураджаі, ангар пераўтварыць у сельскагаспадарчы рынак і цяпліцы, а плошчу перад рынкам зрабіць выставачнай прасторай і стварыць музей беларускай аграрнай прамысловасці.

Ідэі

НАВАПОЛАЦК ІЗНОЎ НОВЫ. ВЕРСІЯ 2.0

Дакумент па пераўтварэнні горада аналагічны полацкаму, аднак ён мае і сваю спецыфіку. Трансфармаванне скіравана на павышэнне прывабнасці горада як месца для жыцця, работы, інвеставання на аснове рэалізацыі нацыянальных прыярытэтаў развіцця, забеспячэння ўстойлівага эканамічнага росту і паляпшэння якасці навакольнага асяроддзя.

Актуальнае развіццё Наваполацка да 2040-га ставіць у прыярытэт задачы зрабіць горад папаўняльным, разумным, зручным. Распрацавана транзітна-арыентаваная мадэль узаемаўвязвання старых і новых цэнтраў у маштабе рэгіёна. Яна прадугледжвае агламерацыю Полацка і Наваполацка вакол цэнтра існуючага Наваполацка на вуліцы Маладзёжнай.

У плане прапісана рэалізацыя чатырох тэм. Гэта фарміраванне адзінай водна-зялёнай сістэмы; развіццё інфраструктуры эканомікі замкнёнага цыкла; павышэнне камфортнасці пражывання з дапамогай разумных тэхналогій; транзітна-арыентаванае развіццё.

У сучасным дзявятым мікрараёне Наваполацка не выкарыстоўваецца дзве траціны з 27 гектараў яго плошчы. Тут можна дадаткова пасяліць яшчэ 3000 жыхароў, і ў выніку 10 % горада будзе жыць у адным раёне. Шчыльнасць насельніцтва пры гэтым узнімецца да максімальных паказчыкаў (хоць Наваполацк і так чэмпіён па гэтым крытэрыі), затое паверхавасць дамоў знізіцца ад васьмі да чатырох з паловай, лічаць эксперты.

Трансфармаваць прастору тэрыторый Наваполацка, якія знаходзяцца ў чарзе на капрамонт, паспрабавалі студэнты Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і Цэнтра ўрбаністыкі і дызайну (ЦУД).

У горадзе шмат дрэў і вялікі патэнцыял, аднак тэрыторыя не запатрабавана жыхарамі, а ўсе пешаходныя прасторы — у профілі вуліц. Скверы і іншыя зялёныя кавалачкі, якія першапачаткова закладваліся праекціроўшчыкамі мікрараёнаў, так і засталіся кавалачкамі, куды максімум дасаджваюцца дрэвы. Грамадскія прасторы не інтэграваны ў сістэму гарадскога цэнтра і не спакушаюць людзей рухацца пешшу, нават гуляць з дзіцячай каляскай можна толькі ўздоўж магістральнай вуліцы Маладзёжнай.

— Пры гэтым ёсць магчымасць уключыць у сістэму «зялёных» зносін увесь горад. Планіровачная структура горада, якая склалася, мае вялікі патэнцыял для стварэння адзінай пешаходнай сістэмы, што аб'яднала б гарадскі цэнтр са значнымі грамадскімі прасторамі, — заўважыла **Вікторыя МАЦВЯЙЧУК, кіраўнік праектаў, старшы выкладчык кафедры архітэктуры Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.** — Я хацела даць студэнтам не нейкія абстрактныя вучэбныя заданні, а такія, каб яны сваімі праектамі змаглі прынесці карысць гораду і зрабіць яго сваімі прапановамі лепшым.

Сярод мноства студэнцкіх прапаноў два праекты ўжо рэальна спадабаліся кіраўніцтву Наваполацка і, магчыма, з часам будуць рэалізаваны.

Напрыклад, сквер, які прылягае да вуліцы Дзяржынскага, студэнты вызначылі як адзін з цэнтраў прыцягнення людзей. Праз яго месцічы часта ходзяць на работу ці проста выбіраюць яго для шпацыру.

— Мы імкнуліся зразумець, як выкарыстоўваецца гэтая тэрыторыя. Аказалася, што хоць людзі і бываюць у ёй штодня, аднак пераважна толькі для транзіту, — расказалі студэнты.

Аўтары праекта вырашылі, што пры мінімальных выдатках у гэтай грамадскай прасторы трэба стварыць нешта такое, у што маглі б уцягнуцца мясцовыя жыхары. Галоўнай ідэяй пераўтварэння сквера стала стварэнне інтэрактыўных гульнявых зон. У прыватнасці, плануецца зрабіць настольныя гульні ў вялікім маштабе, якія аб'яднаюць людзей, вымусяць іх выйсці на вуліцу і камунікаваць.

— Гэта могуць быць нейкія простыя формы з натуральных матэрыялаў, якія можна стварыць самім. Падвесныя крэслы, гамакі, драўляныя гульнёвыя элементы накшталт паласы перашкод, — прапанавалі юныя трансфарматары.



Аўтар фота-карцінкі — студэнтка Ганна ПУТРЫНА.

Асноўную транзітную частку сквера вырашана зрабіць прагулачнай, але каб там хацелася не толькі прагуляцца, але і затрымацца.

Другі праект датычыцца тэрыторыі насупраць бізнес-цэнтра «Эдэм». Яна таксама найчасцей выкарыстоўваецца для транзіту. Зрабіць яе больш прывабнай прапануецца за кошт стварэння зоны ціхага адпачынку, або зоны grandparents, дзе людзі, старэйшыя за 50, маглі б пасядзець і згуляць у «настолкі». Для павышэння камерцыйнай прывабнасці тут можна стварыць участкі для вулічнай ежы, напрыклад, у выглядзе перасоўных вагончыкаў food truck. А простая вулічная мэбля дапаможа арганізаваць месцы, дзе можна будзе ладзіць пікнікі.

— Асноўная ідэя абодвух гэтых праектаў у тым, што людзей можна аб'яднаць яшчэ на стадыі будаўніцтва. Усе ідэі можна рэалізаваць сіламі людзей, што жывуць на гэтых тэрыторыях. Гэта дапаможа і з суседзямі лепш пазнаёміцца, і прымусіць ставіцца да створанага больш беражліва, — упэўнена кіраўнік праектаў.

Матэрыялы падрыхтавала Ірына СІДАРОК.

Праблемы і рашэнні

З РОВАРА — НА КВАДРАЦЫКЛ!

Спецыялісты занальнага інстытута раслінаводства ў Шчучыне пераселі на квадрацыклы, каб маніторыць палеткі

Гродзенскі занальны інстытут раслінаводства НАН Беларусі закупіў тэхніку на ўсе чатыры аддзелы — па адным квадрацыкле на кожны. Тут вырашылі, што гэта дасць магчымасць весці нагляд за пасевамі больш аператыўна. Раней навукоўцы ажыццяўлялі яго на роварах, што патрабавала шмат часу.

Новая тэхніка прыбыла ў навуковую гаспадарку нядаўна. Праўда, напачатку купілі толькі адзін квадрацыкл, каб пратэсціраваць яго ў палявых умовах. Некалькіх соцень кіламетраў было дастаткова, каб упэўніцца, што тэхніка высокапраходная, надзейная і развівае нядрэнную хуткасць — да 60 кіламетраў у гадзіну. Таму закупілі яшчэ тры адзінкі. Па словах **дырэктара занальнага інстытута Сяргея ШЭЎЧЫКА,** цана прымальная — 4200 рублёў за штуку. Гэта значна танней, чым аўтамабіль, а кіраваць ім нашмат лягчэй, бо замест каробкі перадач усталяваны пераключальнік «уперад — назад»: дастаткова націснуць на газ, і машына будзе рухацца ў патрэбным напрамку. Расход бензіна на 100 кіламетраў складае сем літраў.

— Квадрацыклы ёсць у кожным аддзеле — каму трэба, той садзіцца і едзе. У чым тут плюс? Напрыклад, не кожная жанчына сядзе за руль матацыкла. А вось з апаратам на чатырох колах яна справіцца без праблем. Тэхніка выдатна пераадольвае гравійныя дарогі нават пасля дажджу, а шырокія колы не прымінаюць пасевы на палях. Да таго ж на ёй можна везці двух чалавек і нейкі груз, — растлумачыў кіраўнік установы.

Яшчэ значны плюс — для квадрацыклаў не патрабуецца ні тэхагляд, ні атрыманне правоў на кіраванне. Амаль што ровар, толькі больш магутны і мае больш колаў.

Дарэчы, да гэтага навукоўцы аб'язджалі свае палеткі менавіта такім чынам, і на такія паездкі траціласа нямала часу. Цяпер аператыўнасць маніторынгу палеткаў павялічылася ў разы.

— Кожны дзень трэба быць на полі, нават пад'ехаць да таго ж камбайна, калі ідзе ўборка. У нас 23 культуры і 226 сартоў, і за імі патрэбны кантроль. На ровары складана адсочваць дынаміку, стан, развіццё раслін на аддаленых участках. Цяпер іншыя тэмпы, да таго ж спецыяліст траціць больш часу на навуку, а не на дарогу, — канстатуе суразмоўца.

Неабходнасць мабільнай тэхнікі абумоўлена і новымі плошчамі. За апошнія некалькі гадоў яны значна выраслі. Сёння тут 1300 гектараў, з якіх тысяча — гэта непасрэдна вопытныя ўчасткі і дэманстрацыйныя пасевы. Займаюцца навукоўцы вырошчваннем збожжавых, зернебабовых культур, шматгадовых траў. Яшчэ два аддзелы працуюць над паляпшэннем насення бульбы і яблыкаў. І пад кожную культуру плошчы выраслі. Напрыклад, колькасць зямлі, адведзенай пад шматгадовыя травы, павялічылася амаль у дзесяць разоў — з 26 да 250 гектараў.

Трэба сказаць, што навукоўцы шчыльна заняліся кармавой базай. Тут вывучаюць кармы, якія маглі б даць дадатковы рэзерв для павышэння вытворчасці дойнага статку. Спрабуюць культываваць віды, якія не мелі шырокага распаўсюджання, — нядаўна, напрыклад, закладзены плантацыі эспарцэту і донніку, дарэчы, вядомых як меданосы. Пасеялі ўчастак пад чыну лугавую — гэтая расліна з жоўтымі кветкамі з сямейства бабовых мае і лекавыя ўласцівасці, выкарыстоўваецца пры лячэнні бранхітаў і запаленняў лёгкіх.

— Апошнім часам працуем са шматгадовымі травамі, каб адаптаваць іх да засухі. Праводзім навуковыя вопыты з такой культурай, як амарант. Гэтая расліна — рэкардсмен па ўтрыманні бялкоў, таму варта прыстасаваць яе да нашага клімату. Вывучаем, як яна будзе сябе паводзіць у гарачае надвор'е, бо ў мінулыя гады назіралася засуха, і мы недабіралі ўраджай нашых традыцыйных культур, — расказвае Сяргей Шэўчык.

Напрацовак нямала. Напрыклад, вядуцца сумесныя даследванні па селекцыі кармавых бабовых з расійскім навуковым цэнтрам збожжавых і зернебабовых культур. Інстытут працуе разам з аўстрыйскай фірмай па селекцыі гароху і з'яўляецца прадстаўніком фірмы ў Беларусі па некаторых яго сартах.

Вядуцца работы па ўдасканальванні бульбы. Традыцыйная беларуская культура цікавіць і замежнікаў: інстытут актыўна супрацоўнічае з Расіяй і Украінай, таксама праяўляюць інтарэс партнёры з Малдовы і Сербіі. Каб задаволіць попыт, плошчы пад бульбяныя палеткі значна павялічылі. Гэта дае магчымасць атрымаць больш насення і пасадачнага матэрыялу. Такая ж работа вядзецца і па збожжавых культурах.

— Сеем насенне, працуем з фірмамі розных краін — у іх купляем ці нашы прадаем. Калі насенне дае добры ўраджай, прапаноўваем нашым вытворцам, каб яны прыехалі, убачылі, параўналі, — расказвае суразмоўца. — Цяпер многія гаспадаркі займаюцца садамі. У нас таксама ёсць добрыя напрацоўкі. Сад залажылі па інтэнсіўнай тэхналогіі, кожнае дрэва падвязана да бамбуку, які яго трымае, каб не зламалася. Ураджай атрымліваецца ўжо на другі год.

У інстытуце лічаць, што новая тэхніка будзе спрыяць лепшаму нагляду за пасевамі, своечасоваму рэагаванню на негатыўныя фактары. Дарэчы, кантроль за палеткамі ажыццяўляюць не толькі на квадрацыклах, але і з дапамогай квадракоптара: з вышыні птушынага палёту можна ахапіць значную плошчу ды ацаніць якасць пасеваў і апрацоўкі. З боку ж не заўсёды можна ўбачыць, што робіцца ўсярэдзіне. Па словах кіраўніка ўстановы, квадракоптар выяўляе, як працуе тэхніка — ці не прастойвае. Таксама ён і добры ахоўнік: дапамагае заўважыць, ці няма зладзеяў, якія забраліся ў сад ці на пасевы.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Ініцыятыва

ІНТЭРНЭТ-ГАЛАСАВАННЕ КОНКУРСУ «ПРАВА НА ДЗЯЦІНСТВА»

распачалося сёння ў сацыяльных сетках Міністэрства юстыцыі

Штогадовае творчае спаборніцтва, арганізаванае Мінюстам сумесна з Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЕФ) для дзяцей і падлеткаў, сёлета сабрала рэкордную колькасць юных удзельнікаў. На рэспубліканскі конкурс даслана каля дзвюх тысяч малюнкаў і больш за 300 відэаролікаў і камп'ютарных анімацый з усіх куткоў Беларусі.

Конкурс праводзіцца па трох намінацыях: «Малюнак», «Анімацыя», «Відэаролік». Удзельнічаюць у ім дзеці ад трох да 18 гадоў. Сёлета, упершыню пры вызначэнні найлепшых аўтараў твораў, акрамя меркаванняў конкурснай камісіі будуць улічвацца і вынікі інтэрнэт-галасавання.

Карыстальнікі сацыяльных сетак могуць падтрымаць сваім голасам упадабаныя работы па наступных спасылках:

- **намінацыя «Малюнак» (узрост 3—6 гадоў);**
- **намінацыя «Малюнак» (узрост 7—12 гадоў);**
- **намінацыя «Малюнак» (узрост 13—18 гадоў);**
- **намінацыя «Анімацыя»;**
- **намінацыя «Відэаролік».**

— Праз творчасць малыя прадставілі сваё бачанне рэалізацыі правоў дзіцяці, сацыяльнай абароны сям'і і дзяцей дзяржавай. Цікава адлюстраваны тэмы абароны правоў дзяцей-сірот, правы дзяцей-інвалідаў. Не пакінулі без увагі і тэму абавязкаў дзіцяці. Журы было вельмі цяжка вызначыць канкурсантаў для ўдзелу ў этапе інтэрнэт-галасавання. Гэтаму папярэднічалі гадзіны праглядаў і пасяджэнні, абмеркаванні і дыскусіі, — расказала **Вольга ШЫБКО, прэс-сакратар Міністэрства юстыцыі.** *— У крэатыўным спаборніцтве ўдзел узялі таксама дзеці з асаблівасцямі развіцця, дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, выхаванцы дапаможных школ-інтэрнатаў. Гэта сведчыць пра тое, што творчасць і права дзіцяці не маюць абмежаванняў. Больш за ўсё, дарэчы, работ даслалі хлопцы і дзяўчаты з Мінскай і Магілёўскай абласцей.*

Міністэрства юстыцыі дзякуе ўсім удзельнікам і аб'яўляе аб пачатку інтэрнэт-галасавання, якое пройдзе з 1 да 20 жніўня, шляхам размяшчэння саміх работ і адзінай для ўсіх Google-формы з указаннем парадкавага нумару твора, прозвішча, імя і ўзросту канкурсанта. Пазнаёміцца з усімі дапушчанымі да ўдзелу ў гэтым этапе конкурсу аўтарамі і іх работамі можна на старонцы міністэрства https://minjust.gov.by/press/news/the_ministry_of_justice_launches_online/, а таксама на афіцыйных старонках у сацыяльных сетках «УКантакце», Facebook, «Аднакласнікі», на YouTube і Telegram-каналах Мінюста.

Найлепшыя ў кожнай намінацыі вызначацца да 1 верасня шляхам суміравання балаў па выніках інтэрнэт-галасавання і выбару конкурснай камісіі. Пераможцы атрымаюць памятныя падарункі і дыпломы падчас урачыстай цырымоніі.

Ірына СІДАРОК.

АПТЭКА ПАД... НАГАМІ

Дырэктар культурна-спартыўнага цэнтра аграгарадка Вусце Чавускага раёна Людміла КАВАЛЁВА, стварыла ўнікальнае аматарскае аб'яднанне «Лаўка траўніцы», якое збірае вакол сябе як моладзь, так і людзей сталага веку. Без яе зёлак і лялек-скарбонак не абыходзіцца ні адно свята, а сувеніры з гаючымі травамі заўжды дораць ганаровым гасцям раёна. Настоі і гарбата ад траўніцы-бабулі Люды не раз дапамагалі землякам справіцца з хваробамі.

Людміла Кавалёва больш за трыццаць гадоў працуе ў сферы культуры. Яе плённую дзейнасць неаднаразова адзначалі ганаровымі граматамі.

— Зёлкі нарыхтоўваць і ўжываць у паўсядзённым жыцці мяне навучыла бабуля, якая імі лячыла сваіх землякоў. Маленькай дзяўчынкай хадзіла з ёй на заліўны луг, — кажа мая суразмоўніца. — Старалася запомніць усе парады, кожную расліну. Цяпер і сама дзялюся сваімі ведамі з землякамі. Навучыла сваіх дачок карыстацца «зялёнай аптэкай», а зараз жыццёвую мудрасць перадаю ўжо ўнукам.

Таццяна МАЛІНІНА.
Фота аўтара.

КАМУ ДАБАЎКІ?

РАССТАВІМ УСЕ КРОПКІ НАД «Е»

Спецыялісты здаровага харчавання заклікаюць нас чытаць састаў прадуктаў, якія мы набываем. Але калі вы не тэхнолаг, гэта мала дапаможа: вока спатыкнецца на пераліку Е-кодаў з трохчатырохзначнымі лічбамі. Поўны каталог харчовых дабавак — тых самых «Е», пра якія столькі пішуць апошнім часам, — налічвае сотні найменняў. Пра тое, што стаіць за гэтымі доўгімі кодамі, мы вырашылі распытаць эксперта.

— Сёння ў наша грамадства прыйшло разуменне, што для доўгага здаровага жыцця важна якасная натуральная ежа. Каб выбраць менавіта такія прадукты, трэба ўмець разбірацца ў маркіроўцы, нанесенай на ўпакоўку, — зазначае **намеснік дырэктара РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук па харчаванні», дацэнт Алена МАРГУНОВА.**

Перш за ўсё неабходна звярнуць увагу на наяўнасць на ўпакоўцы інфармацыі, абавязковай для вытворцы згодна з тэхнічным рэгламентам Мытнага саюза «Харчовая прадукцыя»:

- найменне харчовага прадукту;
- найменне і месцазнаходжанне вытворцы;
- таварны знак;
- колькасць харчовага прадукту;
- састаў;
- тэрмін ужывання;
- дата вырабу;
- харчовая каштоўнасць прадукту;
- рэкамендацыі і (або) абмежаванні па ўжыванні прадукту;
- звесткі пра наяўнасць у прадукце кампанентаў, атрыманых з выкарыстаннем генна-мадыфікаваных арганізмаў;
- абазначэнне стандарту ці іншага нарматыўнага прававога дакумента, у адпаведнасці з якім выраблены прадукт;
- штрыхавы ідэнтыфікацыйны код;
- умовы захоўвання прадукту (у тым ліку пасля адкрыцця ўпакоўкі);
- найменне і месцазнаходжанне ўпакоўшчыка прадукцыі;
- адзіны знак абарачэння прадукцыі на рынку дзяржаў — членаў ЕАЭС.

Калі ўсе гэтыя звесткі ёсць на ўпакоўцы, значыць, перад вамі — якасны прадукт. Цяпер чытаем састаў і расшыфроўваем «Е».

ХІМІЯ І ЖЫЦЦЁ

Без харчовых дабавак сёння немагчыма вырабіць прамысловым спосабам ні адзін прадукт харчавання. Яны тэхналагічна абгрунтаваныя, адзначае суразмоўніца: менавіта харчовыя дабаўкі надаюць ежы «таварны выгляд» і значна падаўжаюць тэрмін захоўвання каўбас і мясных вырабаў, выпечкі, сыроў, тваражкоў, ёгуртаў — усяго таго прыгожага і смачнага, што мы кожны дзень бачым на прылаўках. Многія з гэтых «Е», калі назваць іх іншымі, блізкімі

shkolazhizni.ru

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

і зразумелымі імёнамі, вядомыя на працягу стагоддзяў. Нярэдка людзі баяцца простых рэчаў з-за складаных назваў.

— Шматлікія «Е» створаны самой прыродай: тыя ж фарбавальнікі з сокаў раслін або вітаміны, — тлумачыць Алена Маргунова. — Яны цалкам бяспечныя. Гэта, напрыклад, натуральныя кансерванты: воцатная кіслата (Е260), малочная кіслата (Е270), яблычная кіслата (Е296). Гэта антыакісляльнікі: аскарбінавая кіслата (Е300), лецыцін (Е322), лімонная кіслата (Е330). Гэта загушчальнікі, якія атрымліваюць з раслін: агар (Е406), карагінан (Е407), камедзь ражковага дрэва (Е410), гуаравая камедзь (Е412). Гэта натуральныя фарбавальнікі: куркумін (Е100) надае прадукту жоўтую афарбоўку, хларафіл (Е140) дае зялёны колер, бэта-карацін (Е160а) — аранжавы, бурачны чырвоны (Е162) фарбуе, адпаведна, у чырвоны, карамель (Е150) — у бэж. Бяспечныя таксама пекціны (Е440) і вітамін В2 (Е101).

Існуе даволі доўгі спіс натуральных дабавак, прызнаных бясшкоднымі ў Еўрапейскім Саюзе. Вось тыя «Е», баяцца якіх не варта:

Е100, Е101, Е160, Е161, Е170, Е174, Е175, Е200, Е201, Е202, Е203, Е236, Е237, Е238, Е260, Е261, Е262, Е263, Е270, Е280, Е281, Е282, Е300, Е301, Е302, Е303, Е304, Е305, Е306, Е307, Е308, Е309, Е322, Е325, Е326, Е327, Е331, Е332, Е333, Е334, Е335, Е336, Е337, Е338, Е339, Е340, Е341, Е400, Е401, Е402, Е403, Е404, Е407, Е409, Е410, Е411, Е413, Е414, Е420, Е421, Е422, Е450, Е461, Е462, Е465, Е466, Е472, Е473, Е474, Е475, Е480.

Але і тут ёсць нюанс. Дабаўка Е322 — гэта лецыцін, трыгліцэрыдны комплекс, які складаецца з фасфаліпідаў. Лецыцін прысутнічае ў жаўтку курынага яйка і ва ўсіх органах і клетках чалавечага арганізма. Гэтае рэчыва нармалізуе ўзровень халестэрыну ў крыві, даводзіць да нормы тлушчавы абмен і служыць прафілактыкай вялікай колькасці захворванняў. Але ў якасці харчовай дабаўкі лецыцін часта атрымліваюць з генетычна мадыфікаванай соі. А харчовай прадукцыі, дзе ёсць генетычна мадыфікаваныя кампаненты, спецыялісты раяць пазбягаць. Уздзеянне гэтых кампанентаў на арганізм чалавека яшчэ цалкам не вывучана.

ГІСТОРЫЯ «Е»

Агульнае правіла пазначаць харчовыя дабаўкі ў выглядзе літары «Е» з лічбамі было прынята ў 1953 годзе. Тады, каб пазбегнуць блытаніны з назвамі інгрэдыентаў, у еўрапейскіх краінах упершыню была створана сістэма лічбавай ідэнтыфікацыі дабавак. Літара «Е» — якраз ад слова Europe. А яшчэ на «Е» пачынаюцца такія словы, як essbar (ням.) і edible (англ.), што ў перакладзе азначае «прыдатны для яды». Праўда, на прыдатнасць для яды многіх «Е» погляды з тых часоў змяніліся.

У свеце існуе больш за 1500 харчовых дабавак, у нашай краіне выкарыстоўваецца каля 350, дазволеных Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Па сваіх функцыях дабаўкі дзеляцца на катэгорыі:

- Е100—182 — фарбавальнікі. Яны надаюць або аднаўляюць колер прадукту.
- Е200—299 — кансерванты, якія павышаюць тэрмін захоўвання прадуктаў, знішчаючы мікробы, грыбкі, бактэрыі.
- Е300—399 — антыакісляльнікі. Гэтыя рэчывы абараняюць ад акіслення (напрыклад, ад прагаркання тлушчаў) і змены колеру.
- Е400—499 — стабілізатары, загушчальнікі. Захоўваюць зададзеную кансістэнцыю прадукту.
- Е500—599 — эмульгатары, якія адказваюць за захаванне эмульсій — сумесяў разнародных вадкасцяў (напрыклад, алею і вады).
- Е600—699 — узмацняльнікі смаку і паху. Так-так, усім вядомы глютамат натрыю таксама тут.
- Е900—999 — пенагасільнікі, прадухіляюць з'яўленне пены або зніжаюць яе колькасць.
- Е1100—1105 — ферменты, біялагічныя каталізатары.
- Е1400—1540 — мадыфікаваныя крахмалы для стварэння неабходнай кансістэнцыі.
- Е1510—1520 — растваральнікі.

Большасць харчовых дабавак, назвы і Е-коды якіх можна сустрэць на ўпакоўках тавараў, не забароненыя да выкарыстання, падкрэслівае суразмоўніца. Аднак іх уплыў на арганізм нярэдка проста не вывучаны да канца. Акрамя таго, важна прыслухоўвацца да сябе і ўлічваць індывідуальныя асаблівасці ўласнага арганізма.

«Е», ЯКІЯ НЕ ВАРТА ЕСЦІ

Найбольш шкодныя Е-дабаўкі, здольныя выклікаць мутацыі ў арганізме, анкалогію і хранічныя захворванні, належаць да катэгорый «Кансерванты» і «Антыакісляльнікі». Дарэчы, спажыванне вялікай колькасці кансервантаў сучасным чалавекам значна тармозіць нават раскладанне чалавечага цела пасля смерці, адзначаюць медыкі. Так, калі яшчэ 50-70 гадоў таму цела памерлага чалавека раскладалася за два гады, дык сёння такі працэс займае 25 гадоў. Пра што гэта сведчыць? Пра тое, што чалавек, спажываючы кансерванты, змяняе сябе на клеткавым узроўні, і наўрад ці гэта падаўжае яму жыццё і дадае здароўя.

Але не будзем пра сумнае. Лепш запомнім, якія Е-коды на ўпакоўцы — знак, што прадукт купляць не варта.

Самая небяспечная Е-дабаўка — гэта фармальдэгід (Е240). Найбольш шкоднасныя фарбавальнікі — Е121 і Е123. Гэта яны надаюць марожанаму і салодкай газіроўцы тыя ненатуральныя, атрутна-яркія колеры, якія так падабаюцца дзецям і падлеткам. Асцярожней неабходна быць з ксілітам (Е968) — яго рэгулярнае ўжыванне можа негатыўна ўплываць на печань.

У АБАРОНУ ГЛЮТАМАТУ НАТРЫЮ

А вось на глютамат натрыю аматары здаровага спосабу жыцця ўзводзяць паклёп дарэмна. Гэтая дабаўка (Е621) — узмацняльнік смаку і паху — сапраўды робіць прадукты харчавання больш апетытнымі, бо ўздзейнічае на смакавыя рэцэптары. Але, як адзначаюць дыетолагі, глютамінавая кіслата, з якой робіцца глютамат натрыю, — гэта адна з 20 амінакіслот, якія ёсць у любым бялку, у тым ліку ў мясе і ў яйках птушак. Такім чынам, выявіць гэта рэчыва можна нават у тых бялковых прадуктах, куды яго спецыяльна не дадавалі.

Сапраўды, глютамат натрыю можа нанесці шкоду — але толькі калі адначасова ўвесці ў арганізм велізарную дозу гэтага рэчыва: 10 г на 1 кг масы цела. Калі вы з'ясце 600—700 г сухой дабаўкі, з'явяцца негатыўныя эфекты. А ў тых мізэрных дозах, у якіх глютамат натрыю паступае ў арганізм з прадуктамі харчавання, ён зусім бясшкодны.

НА ШТО ЗВЯРНУЦЬ УВАГУ

— Дык як жа выбраць у гіпермаркеце сапраўды карысныя, або прынамсі бяспечныя для здароўя прадукты харчавання?

— Я бы раіла падысці да гэтага пытання сур'ёзна. Вазьміце з сабой спіс небяспечных «Е» — цяпер ён у вас ёсць. Уважліва чытайце састаў. Выключыце з рацыёну сваёй сям'і прадукты харчавання, дзе ёсць сінтэтычныя харчовыя дабаўкі, патэнцыйна небяспечныя для здароўя чалавека. Скажыце «не» прадуктам з ненатуральна яркай афарбоўкай, якімі б апетытнымі яны вам ні здаваліся. Ну і арыентуйцеся на тэрмін захавання прадуктаў: чым ён большы ў такіх вырабаў, як малако і тварог, каўбаса і мясныя прысмакі, выпечка і кансервы, тым больш у іх саставе кансервантаў. А кансерванты трэба імкнуцца спажываць як найменш. Лепш за ўсё выбіраць так званыя арганічныя прадукты — тое, што выраблена без прымянення шкоднай «хіміі». На ўпакоўках такіх тавараў ёсць спецыяльная экалагічная маркіроўка (у розных краінах яна свая).

Прадукты са знакам «натуральны прадукт» не адносяцца да катэгорыі арганічных, аднак у іх складзе толькі натуральныя кампаненты і адсутнічаюць шкодныя штучныя дабаўкі.

— Але ці можна давяраць гэтаму знаку?

— Так, яму можна давяраць. Справа ў тым, што да тавараў з маркіроўкай «Натуральны прадукт» прад'яўляюцца спецыяльныя патрабаванні, замацаваныя ў Тэхнічным кодэксе ТКП 126/РП. Харчовая прадукцыя, якая маркіруецца знакам «натуральны прадукт», павінна быць выраблена не менш чым з 95 % натуральнай харчовай сыравіны жывёльнага і (або) раслінnага паходжання, і (або) сыравіны мінеральнага паходжання (соль, вада). Натуральная харчовая сыравіна жывёльнага паходжання — гэта прадукты, атрыманыя ад жывёл, што былі вырашчаны без ужывання антыбіётыкаў, стымулятараў адкорму, гарманальных прэпаратаў, метадаў геннай інжынерыі. Натуральная харчовая сыравіна раслінnага паходжання — тая, што была выраблена без ужывання стымулятараў росту, пестыцыдаў, метадаў геннай інжынерыі. Каб нанесці на сваю прадукцыю маркіроўку «Натуральны прадукт», прадпрыемства павінна мець сертыфікаваныя сістэмы менеджменту якасці і бяспекі харчовых прадуктаў. Так што прадукт з такой маркіроўкай дакладна не ўтрымлівае штучных харчовых дабавак.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ПРОСТА ЗАХАВАЙЦЕ ГЭТЫ СПІС

*** Дабаўкі, забароненыя на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь:**
Е103, Е106, Е111, Е121, Е123, Е126, Е130, Е181, Е216, Е217, Е240, Е924, Е924а.
*** Дабаўкі, забароненыя ў Расійскай Федэрацыі:**
Е121, Е123, Е128, Е217, Е240, Е924а, Е924b.
*** Дабаўкі, забароненыя ў краінах Еўрапейскага Саюза:**
Е103, Е105, Е111, Е121, Е125, Е126, Е152, Е181, Е1330.

Лініі жыцця

КАЛІ Б НЕ ТУМАН...

«Вы б асцерагаліся гэтай дзеўкі, — сказала бабуля, упершыню ўбачыўшы Жанну. — Дужа хітрая яна, ненадзейная...»

Тады, на пачатку вучобы ў інстытуце, нам здавалася, што гэта няпраўда. Праз пару гадоў — што ў бабуліных словах нешта, здаецца, было. А ў самым канцы вучобы Жанна ўжо не вельмі і хавала, што трапаць нервы з дзецьмі ў правінцыйнай школе — гэта «адстой», што ў сталіцы без блату і сталічнай прапіскі добрай работы не знойдзеш... Таму выйсце адно — выйсці замуж.

За каго, ёй доўга выбіраць не давялося: кавалераў хапала, бо дзеўка была прыгожая, бойкая, па слова (нават англійскае ці іспанскае) ў кішэнь ніколі не лезла...

Што для нас было нечаканым, выбар свой яна спыніла на Віктары, які таксама паходзіў з досыць беднай вясковай сям'і. Але ж пры гэтым, Жанна хвалілася, бліскуча адвучыўся на перакладчыка, і зараз яму «свяцілі» не толькі добрыя заробкі, але і замежныя камандзіроўкі. А значыць, з ім можна было паглядзець, як людзі жывуць у краінах з «загніўшым» капіталізмам, і, калі спадабаецца, там нават застацца.

Пажаніцца яны збіраліся ў канцы жніўня, а пакуль, каб зарабіць грошай, Віктар падаўся некуды на Поўнач на так званую шабашку. Паехаў разам з брыгадай, як многія ездзілі. І вярталіся... А ён не вярнуўся — загінуў пры няясных абставінах, пакінуўшы Жанне кароткую тэлеграму з незразумелымі словамі «жэ тэм» (je t'aime, фр. «я цябе кахаю») і... сыночка, таксама Віцю, які нарадзіўся потым — у студзені...

Летам жа, пагараваўшы ў горадзе, Жанна з'ездзіла да мамы — «без дзіцяці», бо з'явіцца з ім у прыполе ёй (дарэчы, такой жа «прыпольнай») зусім не выпадала, — сказала, што яе адпраўляюць на стажыроўку ў Кубу, і асела ў сталіцы.

Да родаў зарабляла ўрокамі (тым жа рэпетытарствам), потым на экраны выйшаў фільм пра інтэрдзяўчынак, і Жанна, пакінуўшы малога на кватэрную гаспадыню ды прыбраўшыся ва ўсё найлепшае, завітала ў рэстаран пры гасцініцы, зрабіла выгляд, што некага чакае.

Першым, хто звярнуў на яе ўвагу, быў сталы немец. Па-нямецку Жанна гаварыла ў рамках школьнай праграмы, але той валодаў англійскай, яны хутка паразумеліся, шыкоўна павячэралі і падняліся ў нумар. З яго Жанна выйшла з прыемнымі ўспамінамі і сотняй нямецкіх марак.

Першы блін атрымаўся ўдалым, варта, здавалася, «пячы» яшчэ і яшчэ — было чым разлічыцца і з нянькай, і з метрдатэлем у рэстаране. Складаней было з каляжанкамі, дакладней — з канкурэнткамі. Адносіны давялося высвятляць у дамскай прыбіральні, і ад мардабою Жанну ўратавала хіба тое, што таваркі былі маладыя і замежныя мовы ведалі дрэнна. Яна ўзялася дапамагаць ім — шукаць агульную мову з іспанцамі, французамі, італьянцамі. І, здавалася б, пайшло-паехала, калі б...

Сына — з цвёрдым абяцаннем рэгулярна прыходзіць і забраць, як толькі знойдзе работу, — яна аформіла ў Дом малечы...

А следам пачала сваё новае, «прыгожае жыццё»: вечарам і ўначы была на рабоце (калі гэты занятак можна так называць), зранку і днём спала. Але ж зняла-такі асобную кватэру і нават абжылася, за некалькі месяцаў накупляла дарагой парфумы, абутку, імпартных шмотак... Да малога не з'ездзіла ні разу — ці то адвыкла, ці то прывыкнуць не паспела... А таму афіцыйны ліст з паведамленнем, што Віцю ўсынавіла сямейная пара без жыллёвых і матэрыяльных праблем, яе не надта і засмуціў.

Непрыемнасці здараліся з-за іншага: ёй маглі не заплаціць, маглі сярод ночы выгнаць, «сапсаваць фасад» (гэта значыць, пабіць...). Калі-нікалі даводзілася плаціць міліцыянерам, каб не заўважалі таго, што павінны.

Гады праз два, калі шмаццё ўжо не змяшчалася ў шафах, Жанна купіла сабе двухпакаёўку, стала хадзіць на розныя выстаўкі ды прэзентацыі. Там выбірала чарговую ахвяру, запрашала дамоў. Ад валюты рашуча адмаўлялася, але які-небудзь залаты сувенір прымала з ахвотай. А гэта былі ўжо іншыя грошы, за якія гаспадыня па-еўрапейску аздабляла сваю кватэру ў горадзе і матуліну хату ў вёсцы, дзе яе раздражняла толькі адно: роспыты ўсіх і кожнага, калі ўжо яна, такая прыгожая ды разумная, выйдзе замуж?

Стаміўшыся ад гэтых пытанняў, Жанна аднойчы і ляпнула, што калі за нейкага галадранца і п'яніцу, то ніколі, а вось за багатага англічаніна ці іспанца, дык вельмі можа быць... І тады ўжо з'ездзе сама і маму забярэ.

Тая (хто ведае?) мо, хацела ўявіць, а мо, іншае нешта ўдумала, але пасля гэтага стала загаворвацца, забывацца паесці, выключыць газ, зачыніць комін...

Мясцовы доктар ніякіх хвароб у яе не знайшоў, сталічныя таксама — хіба ўзроставыя змяненні? А жанчыне, між тым, станавілася ўсё горай і горай, таму ўрэшце Жанна здала сваю кватэру таварцы па рабоце і часова вярнулася ў вёску.

...У тыя ж гады, але на іншай арбіце, віравала жыццё яе аднавяскоўца дзядзькі Колі. Той з талковага інжынера ператварыўся ў досыць

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

паспяховага прадпрымальніка, падняўся на гандлі камп'ютарамі. (Немцаў, дарэчы, здзівіў пры першай жа дзелавой сустрэчы — і не столькі добрым веданнем іх мовы, колькі... пацераў, якое змог захаваць у бязбожным Савецкім Саюзе.)

З падачы тых здзіўленых замежных калег стаў гандляваць мабільнікамі, дом пабудаваў для сябе, потым яшчэ два — для замужніх дачок. У школе, дзе вучыўся сам, як і ў тых, куды хадзілі ўнукі, абсталяваў камп'ютарныя класы. На вясковых могілках новую капліцу паставіў, планаваў яшчэ два кіламетры новай дарогі пралажыць...

А бяда прыйшла адкуль не чакаў: на цукровы дыябет захварэла жонка, потым да яе ж прычапілася яшчэ колькі хвароб. І куды яны ні ездзілі, чаго ні рабілі, вынік быў адзін, вядомы ўсім і загадзя: здароўя не купіш — нават за вельмі вялікія грошы.

Свае апошнія гады і дні хворая дажывала то з дочкамі ў час іх дэкрэтных, то з мужам у доме яго бацькоў, у царстве кветак і... катоў, якім, нягледзячы на хваробу, Жанніна маці, а потым ужо і дачка, штодзень прыносіла малако.

...Так і «стрэліся дзве адзіноты».

Праз работу і хваробы жонкі Мікалай стаў забывацца, што ён мужчына, але Жанна змагла нагадаць, што Чарлі Чаплін апошні раз стаў бацькам у 73 гады, Эрве Базен — і наогул — у 80!

Пра Базена Мікалай распытваць не стаў, а Чапліна ў фільмах бачыў і нават неяк акрыяў, бо на добры дзясятак гадоў быў маладзейшы...

Аб чым яшчэ там былі размовы, гісторыя замоўчвае, факт, што справы ішлі да ціхага вяселля ў вузкім сямейным коле, ці, як мінімум, да роспісу ў сельсавеце.

...Сярод тыдня Жанна вырашыла махнуць у горад, забраць пашпарт, а насамрэч, каб пахваліцца перад сяброўкамі сваімі перспектывамі, каб годна развітацца з былым жыццём — зрабіць так званы дзявочнік. (Мабільнік яна пакінула дома, каб будучы муж не даймаў званкамі. А каб не павёз яе сам, спецыяльна выбрала дзень, калі ён чакаў аўтакран і машыну з трубамі для рамонту дарогі.)

Таваркі «адарваліся» тады на славу, як тыя першакурсніцы, аж па той бок ночы: чаго толькі не елі-пілі, чаго не выраблялі... Потым яшчэ выбіралі таксіста, з якім можна разлічыцца натурай, бо «раптам мужу яна не патрэбная?» — смяяліся дзяўчаты. А Жанна адбівалася, казала, што галоўнае — трапіць у сям'ю, а там... «Два зяці ў чалавека... Хоць адзін ды клюне, калі «пад градусам...»

Сама ж яна, даглядаючы маці, амаль адвыкла ад алкаголю, таму глядзела на «абранага» таксіста нібы праз сон. І ўжо канкрэтна засынаючы, тлумачыла маршрут.

З гадзіну яны ліха імчалі па апусцелай шашы, потым разоў колькі спыняліся (пасажырку ванітавала), а на пад'ездзе да возера, ад якога было рукою падаць да Жаннінага мястэчка, трапілі ў гэткі туман, што спачатку проста збавілі хуткасць, а потым і наогул сталі. Разбудзіўшы пасажырку і пачуўшы, што ім трэба звярнуць у лес, таксіст заявіў, што «сустрэча» з ласём у планы яго не ўваходзіць (нават за вялікія грошы), а таму — «на выхад, маўляў... Калі ласка...»

«Бач які ветлівы! — абурылася Жанна. — Ён лася баіцца... А я, жанчына, што — нічога?!» «А дзе яна? Хто тут жанчына? — у адказ засмяяўся таксіст. — Ты? П'янь... Шалахвостка. Дойдзеш дадому, у люстэрка на сябе паглядзі». — «Ну і дайду», — пасажырка ляпнула дзвярыма.

На дарозе было ціха і цёмна — хіба вецер даносіў «пераклічку» сабак. Намацваючы нагамі дарогу, Жанна пабрыла на іх галасы і, на шчасце, хвілін праз колькі ўбачыла напарадзе нейкі агеньчык. Так і ёсць: на аўтобусным прыпынку ў плашчы з паднятым башлыком курыў нейкі дзед.

Жанна спытала ў яго, ці правільна ідзе да мястэчка... І толькі тут, па голасе, пазнала Мікалая, які, знерваваўшыся, узяў ліхтар і выйшаў яе шукаць.

Давялося завесці дадому.

Там хацеў распытаць, ці добра з'ездзіла, аднак «падарожніца», моцна абняўшы сумачку, адразу ж завалілася спаць.

Мікалай разуў яе, хацеў сцягнуць запэцканы белы пінжак, у рукі ўзяў сумачку... Закарцела зазірнуць туды — даведацца, што ж за скарб яму паслалі нябёсы. І не ўтрываў — дастаў пашпарт (і знайшоў там запіс пра дзіця), убачыў афіцыйны ліст з паведамленнем пра ўсынаўленне.

А раніцай ні тлумачэнняў, ні апраўданняў ён слухаць не стаў: паказаў на дзверы і папрасіў іх больш не адчыняць — ніколі.

Праклятый туман...

Ці ўсё ж пахвалёны?!

Іван БОЙКА,
г. Баранавічы.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 25 (513)

Улада СЯНЬКОВА:

«Беларускае кіно можа лёгка ўвайсці ў моду»

Прэм'ера карціны ІІ, якая адбылася на мінулым кінафестывалі «Лістапад», стала сапраўднай падзеяй з усімі належнымі атрыбутамі — гучным кантэкстам, натоўпам у кінатэатры ды доўгімі рэфлексіямі, якія пацвердзілі, што фільм трапіў у яблычак. Яе рэжысёрка Улада СЯНЬКОВА закранула школьны булінг, стаўленне да гомасексуалаў, стэрэатыпы аб ВІЧ-інфіцыраваных і паказала, як у гэтых кірунках выглядае наша грамадства (для тых, хто не бачыў стужку, — крайне непрывабна). Карціна, знятая за сціплую колькасць грошай і здымачных дзён, сцвердзіла Уладу як адну з галоўных прадстаўніц беларускага незалежнага кіно. Цяпер аўтарка, вядомая таксама амбітным дэбютам «Граф у апельсінах» і ладным кароткім метрам Paranoid Android, вучыцца ў варшаўскай Школе Вайды, дарабляе маладзёжны фільм «Пражэкцёры» і распрацоўвае праект «Памылка 404». Мы запыталі рэжысёрку пра нашу шматпакутную кінаіндустрыю, яе новыя карціны і дзе беларускіх кіношнікаў чакаюць з расхінутымі абдымкамі.

— У якасці маладога незалежнага рэжысёра як ты адчуваеш сябе ва ўмовах беларускай кінаіндустрыі?

— Быццам знаходжуся па-за беларускай кінаіндустрыяй. Гэта як у камедыі «Краіна Оз» Васіля Сігарава, дзе галоўная гераіня праходзіць праз суцэльны трэш і ў канцы на пытанне, чаму яна хоча з'ехаць, адказвае: «Неяк не прыжылася». Я таксама кажу, што не прыжылася; калі мець на ўвазе індустрыю з фінансаваннем Мінкульта, я сябе з ёй не асацыюю. І ўвогуле ці існуе беларуская кінаіндустрыя? Ёсць супольнасць цудоўных людзей, якіх я паважаю і люблю, праўда, нават калі конкурс кінапраектаў упершыню за доўгі час даў добры вынік, мы сталі адно на аднаго пісаць даносы. Наша культурная сфера недастаткова развітая, каб гаварыць пра паўнавартасную кінематаграфію. Узяць Індустрыяльную платформу «Лістапада»: розныя людзі апавядаюць, як з беларускімі грашыма, нават з дваццацаю працэнтамі бюджэту, увайсці ў капрадукцыю і зняць кіно, маўляў, што вы седзіце. Але гэтыя размовы бессэнсоўныя, бо нам усё яшчэ трэба мець тыя дваццаць працэнтаў «дамашніх» грошай, а атрымаць іх немагчыма. Адпаведна, застаецца, калі ўсе зоркі сыдуцца, здзіўляць тым, што здымаеш за капейкі. Школа Вайды дала нам каля тысячы долараў на здымкі сцэны, дык мае аднагрупнікі пажартавалі, што я за гэтыя грошы зраблю ўвесь фільм.

— Апошнім часам у Беларусі шмат абмяркоўвалася, колькі насамрэч павінен складаць бюджэт кіно. Колькі каштавалі твае фільмы і колькі ты б хацела, каб яны каштавалі?

— На «Графа ў апельсінах» у мяне пайшло пяць тысяч долараў — гэта на здымкі і гук, прытым што ўсе працавалі бясплатна і я манціравала сама. Але потым пачалося прасоўванне «Графа» на фестывальных платформах, і я дагэтуль вінаватая грошы сябрам. Кошт карціны — гэта адна сума, але фільм проста ляжа на паліцу, калі нейкія сродкі не выдаткуюцца яшчэ і на прасоўванне. У нас кажуць правільныя рэчы: менш грошай на праект, значыць больш праектаў, значыць больш магчымасцяў удзельнічаць у капрадукцыях — і беларусаў будуць з задавальненнем браць у партнёры, бо мы вельмі цікавыя за мяжой, асабліва апошнім часам. Цяпер увогуле час нізкабюджэтнага кіно — ідзе сусветны крызіс, фінансаванне Школы Вайды, напрыклад, скараціласа ледзь не ўдвая, на кіно былых грошай таксама даваць не будуць. Застаецца аптымізоўваць каманду і выдаткі — на пляцоўцы, скажам, не патрэбны дваццаць п'яных светлавікоў, дастаткова аднаго добрага гафера.

— Калі маецца на ўвазе нізкабюджэтнае кіно, пра якія сумы ідзе гаворка?

— За сто тысяч, калі не ўлічваць падаткі, можна зняць харошы, дыхтоўны поўны метр. Лепш хай дзесяць чалавек здымуць за 100 тысяч, а я ўпэўнена, у нас дастаткова людзей, якія могуць зрабіць гэта добра, чым нехта адзін атрымае мільён і незразумела, здыме ці не.

— Фільм ІІ ты зняла за шэсць дзён — што ў ім было б лепшым, калі б у цябе было больш магчымасцяў?

— Напэўна, лепшым было б наша здароўе, бо працаваць па васямнаццаць гадзін вельмі цяжка. Неяк на замову ІТ-кампаніі я здымала серыял, і мы працавалі па дваццаць гадзін — мой гукарэжысёр тады настолькі стаміўся, што спатыкнуўся, упаў з лесвіцы і доўга праляжаў у бальніцы. Мне хочацца берагчы каманду, каб яны адчувалі сябе людзьмі і мелі чалавечыя ўмовы працы — першы раз, можа, і прышпільна працаваць суткамі, але бясконца гэта цягнуцца не можа.

— Ты кажаш, беларускіх калег гатовы браць у партнёры — адкуль такое адчуванне?

— На замежных фестывалях да мяне неаднаразова падыходзілі, у тым ліку, напрыклад, прадстаўніца Берлінале, і казалі, што чакаюць нашых праектаў і гатовы іх падтрымаць. Ёсць мода на кіно: калі раней была хваля румынскага кіно, цяпер, я думаю, пачынаецца цікавасць да балканскага, то таксама лёгка ў моду можа ўвайсці беларускае. Нават пасля выхаду «Хрусталя» я заўважыла на міжнародных фестывалях да сябе іншае стаўленне — Беларусь стала цікавай.

— На твой погляд, ці можна назваць адной з прычын стагнацыі нашага кіно існуючую сістэму яго фінансавання?

— Абсалютна. Паглядзець на Украіну: як толькі там наладзілася сістэма фінансавання, у кожным пітчынгу ўдзельнічае па тры ўкраінскія праекты, ледзь не ў кожным конкурсе ёсць украінскі фільм. Адзін бізнесмен, што не мае да кіно ніякага дачынення, вазіў маладых аўтараў на Канскі кінафестываль, каб яны павучыліся. У нас жа кіно ніхто асабліва не хоча займацца — з праектам «Пражэкцёры» мы звярталіся да розных людзей, прычым прасілі абсалютна пасільныя грошы, і ўбачылі, што бізнесу нецікава ў гэтым удзельнічаць.

Фота з асабістага архіва Улады СЯНЬКОВАЙ.

— Ты неяк спрабавала супрацоўнічаць з «Беларусьфільмам» — чаму супраца не склалася?

— Кінастудыя, наколькі я разумею, прапанавала многім маладым рэжысёрам зняць фільм па іх сцэнарыі, а згадзілася толькі я — сцэнарый быў дрэнны, але я падумала, што змагу зрабіць з яго нешта вартае. Праект падаваўся на конкурс Міністэрства культуры, а як працуюць на кінастудыі — праект ідзе на конкурс і запускаецца ў вытворчасць адначасова, настолькі ўсе ўпэўнены, што фільм атрымае фінансаванне, але нам праз некаторы час адмовілі. Я гэтаму рада, бо разумею, што проста выматала б сабе нервы і зняла нейкую фігню — нешта свабоднае, сучаснае, дзёрзкае на «Беларусьфільме» зрабіць, мне здаецца, нельга. Потым я даведалася: праблема была ў тым, што «У сэнсе Сянькова?». Магчыма, я не вельмі прыдатны персанаж для кінастудыі альбо спрацавала адсутнасць спецыяльнай адукацыі.

— Ці зарабляеш ты на кіно?

— Я атрымала ганарар за фільм ІІ і змагла пражыць на яго паўтара-два месяцы, то-бок у адпачынак за гэтыя грошы не з'ездзіш. Потым мне ішоў працэнт ад пракату — я патраціла яго на фестывалі. Гэта ўвесь мой заробак, хоць, мне здаецца, на карціне ІІ можна зарабіць, толькі на гэта павінна працаваць цэлая каманда. Можа быць, сітуацыя ў кінасферы зменіцца, але я і не чакаю вялікіх дывідэндаў.

— Што адбываецца з праектам «Пражэкцёры» і калі публіка яго ўбачыць?

— Я цяпер проста ў агні, бо не магу знайсці гукарэжысёра — усе альбо занятыя, альбо не маюць сіл, а даверыць праект навічку мне складана праз адмоўны досвед. Гук — галоўны «затык» у праекце, але ў маім цудоўным свеце фільм павінен быць гатовы ўжо ў канцы жніўня, а што далей, пакуль невядома. Хацелася б думаць пра фестывалі, але незразумела, ці хутка яны адновяцца ў традыцыйным фармаце.

— У Школе Вайды ты распрацоўваеш праект «Памылка 404» пра хлопцаў, якія збягаюць ад арміі. Ідэя перагукаецца з тваёй кароткаметражкай Paranoid Android — чым гэтая тэма асаблівая для цябе?

— Хоць я і жанчына, якой не пагражае, але я гляджу вакол і шкадую мастакоў, акцёраў, айцішнікаў, якім трэба ісці ў армію, бо лічу, што кожны павінен займацца сваёй справай. Ёсць людзі, якім падабаецца служыць, — хай яны служаць і атрымліваюць за гэта грошы. У Ізраілі таксама служаць усе, праўда, могуць выбіраць фармат службы — знаёмы музыкант у арміі займаецца музыкай. Да таго ж я стамілася ад мілітарысцкай прапаганды і мне хочацца пра гэта пагаварыць — я разумею, што не змяню свет, але прынамсі дапамагу паглядзець на яго іначай. Я яшчэ ніколі не мела такога ўзважанага і абгрунтаванага жадання зняць фільм.

— Што тычыцца карціны ІІ, думаеш, наша грамадства сапраўды такое абыякавае і неразвітае ў стаўленні да гомасексуалаў і ВІЧ-інфіцыраваных?

— Думаю, нам ёсць куды імкнуцца, праблема з гамафобіяй дакладна ёсць, дарэчы, палякі на мой фільм таксама рэагавалі: «Ой, гэта як у нас». А абыякавасць і засяроджанасць на сваіх патрэбах я ўвогуле лічыла нашай асноўнай якасцю, але хочацца верыць, мы гэта прайшлі — апошнім часам цуд што адбываецца, пачынаючы з валанцёраў падчас «ковіда» і ахвяраванняў на карысць урачоў, наша грамадства становіцца іншым.

— Калі ты здымала ІІ, ты перабольшвала ў імя мастацкай ідэі альбо сапраўды адчувала, што адлюстроўваеш рэальнасць?

— Сюжэт, вядома, выдуманы, але я б не сказала, што ён перабольшвае агрэсіўнасць нашага грамадства: у нас у «Фэйсбуку» дарослыя цкуюць адно аднаго кожны дзень, што ўжо казаць пра дзяцей. У маім класе, напрыклад, даволі жорстка здзекаваліся з аднаго хлопца, і хоць ніхто не хварэў на ВІЧ, я лёгка ўяўляю сцэну з фільма ў сваёй школе. Нядаўна чытала, як у нейкім ізраільскім гарадку дзяўчына захварэла на «ковід» і вучні з бацькамі яе зацкавалі.

— Ты вучышся ў Школе Вайды — у будучыні будзеш старацца здымаць у полі беларускага кіно альбо з'едзеш за мяжу?

— Вядома, я буду здымаць беларускае кіно, але паспрабую зрабіць праект і ў Польшчы. Я вырашыла, што не буду змагацца за беларускі кінематограф — ёсць я, я беларуска і здымаю пра тое, што мяне хвалюе, беларуская гэта рэчаіснасць ці сусветны кантэкст: чаму я павінна сябе абмяжоўваць? Дар'я Жук, напрыклад, працуе і ў Беларусі, і ў Расіі, я ўпэўнена, яна хоча працаваць у ЗША і не мысліць катэгорыямі нацыянальнасці. Вось і я буду проста здымаць кіно.

— Што Школа Вайды дазволіла табе зразумець пра кіно?

— Я прыйшла сюды ўжо з досведам, але шмат атрымліваю на эмацыянальным узроўні. У нас ёсць выкладчык Войцех Марчэўскі, які стварыў Школу разам з Анджэем Вайдам: ён абсалютна сучасны — напрыклад, салідарны з рухам #metoo — і надзвычай мудры ў тэме кіно. Калі ён кажа, усе адкладаюць тэлефоны ці ноўтбукі і проста слухаюць. Дваццаць гадоў таму ён перастаў рабіць фільмы, бо зразумеў, што не хоча здымаць, проста каб здымаць, і вырашыў, што чарговую карціну створыць, толькі калі ўзнікне тэма, у якой яму захочацца нешта сказаць. Гэтая пазіцыя, напэўна, стала маім найвялікшым уражаннем ад Школы. Да таго ж я цяпер больш сур'ёзна стаўлюся да кіно і разумею, што ў фільма павінен быць бюджэт, а праца кінематаграфіста павінна аплачвацца: палякі ўпадаюць у істэрыку, калі даведваюцца, што Школа плаціць акцёру менш, чым ён звычайна атрымлівае на здымках. Важным лічу абмеркаванне майго праекта з калегамі — цікава глядзець на яго праз прызму іншай рэальнасці, якая не зусім разумее наш кантэкст. Мая аднагрупніца неяк сказала фразу: «Бачна, што тут ёсць сцэнарыст» — і я вырашыла, што трэба рабіць кіно так, каб сцэнарыста ў ім ніхто не ўбачыў, як у румынскіх фільмах. Я ж прынесла сваім аднагрупнікам ідэю таго, што не трэба чакаць, пакуль фонд дасць грошы, — можна пайсці і зняць бясплатна. Яны нешчаслівыя, бо хочуць зняць фільм і гадамі чакаюць на гэта сродкаў, а я — чалавек, які ніколі грошай не бачыў, — стварае кіно і адчувае сябе шчаслівай.

Гутарыла Сафія ПАЛЯНСКАЯ.

УЛАСНЫ ЗАМАК

Калі скончыцца будаўніцтва, замак будзе такі ж, які быў арыгінал у свае найлепшыя гады. Толькі ў маштабе 1:10.

МОЙ ДОМ — МАЯ КРЭПАСЦЬ

Па дарозе па вёсцы Чухны да дома Сяргея Бандарэнкі важна дэфілюе бусел. Сігналіць бессэнсоўна: ён толькі раздражнёна азіраецца, але не ляціць. Вакол — зарослы разнатраўем луг і маляўнічыя дахі драўляных дамоў, некаторыя з якіх — з забітымі дошкамі дзвярыма і вокнамі. Калі вы шукаеце творчай адзіноты — вам сюды.

— Чаму ствараю копію менавіта Крэўскага замка? — усміхаецца Сяргей. — Воляй лёсу мы апынуліся ў Смаргонскім раёне, а тут — Крэўскі замак. Калі б воляй лёсу апынуўся ў Мальбарку — будаваў бы копію замка Мальбарк. А калі сур'ёзна, то хочацца, каб людзі ганарыліся сваёй гісторыяй. Каб было што паказаць замежным турыстам. Каб нас не абувалі ў лапці! Мясцовыя жыхары часам зусім не ведаюць гісторыі свайго рэгіёна. Напрыклад, герб Гедыміна — Калюмны Трызуб (вось, бачыце, тут над брамай ён выкладзены) — нават адукаваныя людзі блытаюць з трызубцам на гербах кіеўскіх князёў. А людзі без «верхняй» адукацыі — тыя, наогул, кажуць пра нас: «хахлы панаехалі». Хоць прозвішча Бандарэнка распаўсюджана на Магілёўшчыне, адкуль родам мой бацька.

ТРАСКА-ТУГА І «ТВОРЧЫЯ ЎНІВЕРСІТЭТЫ»

— Бацька мой родам з-пад Магілёва — расказвае Сяргей. — А сам я нарадзіўся ў Архангельску. У часы маладосці майго бацькі, каб беларусу з калгаснага «рабства» вырвацца, трэба было ісці або ў шахту, або ў войска. Так мой бацька стаў ваенным маракам. Служыў у Архангельску. Там я і з'явіўся на свет. А калі мне споўнілася тры месяцы, бацька забраў сям'ю і вярнуўся на радзіму. Сказаў, сыну ў Архангельску жыць не трэба.

— Там так дрэнна?

— У людзей там ёсць прымаўка: «Туга, дошка і траска». Любога мясцовага там спытаеце — ён засмяецца і скажа «так». Гэта не беларус прыязджы кажа, гэта людзі, якія там жывуць, — у мяне ж там сваякі засталіся, бо мая мама родам з Архангельска. Аднойчы мяне абазвалі русафобам, калі я пра гэта напісаў. Але нядаўна прыязджаў да нас турыст, хлопец з Архангельска, у яго нават на майцы было напісана: «Тоска, доска и треска». Пасмяяліся з ім, вядома. Але на самай справе гэта не весела.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— У нас, што, лепш?

— Прынамсі, нейкія грошы выдзяляюцца на добраўпарадкаванне. Я доўгі час жыў у Светлагорску. А нядаўна мой сябра пабываў у невялікім расійскім гарадку. Такі ж маленькі горад, як Светлагорск, толькі нічога не скошана, старыя дрэвы не спілаваныя, палова дамоў без вокнаў. Проста памерлая цывілізацыя. Можаце выразаць з тэксту гэтыя мае словы, а можаце не выразаць...

— А як вы сталі мастаком?

— Маляваў з дзяцінства. Проста падабалася. Адукацыя ў мяне не мастацкая, і наогул, я сказаў бы, не творчая — прыборабудаванне. Потым пайшоў у армію. Там спатрэбіўся мастак. Мяне да гэтага далучыў «дзед» — Віктар Шварц. Бачыце, да гэтага часу памятаю яго прозвішча. Яму патрэбны быў хтосьці з маладых, хто змяніў бы яго ў маляванні плакатаў, агітак, выпуску насценгазеты. У мяне выдатна атрымлівалася Леніна маляваць... Такія вось «творчыя ўніверсітэты». Вярнуўся з арміі, папрацаваў па спецыяльнасці ў Светлагорску, а потым у Смаргоні, у філіяле трактарнага завода, вызвалілася месца мастака-афарміцеля. Я падумаў: чаму б і не? Так што акадэмічнай мастацкай адукацыі ў мяне няма. Проста быў інтарэс, і я асвойваў сам розныя тэхнікі — ад работы з глінай і металам да акварэлі, алею, разьбы па дрэве, скульптуры. І вось ужо 36 гадоў гэтым займаюся.

ЛАЙТ-ВЕРСІЯ КРЭЎСКАГА ЗАМКА І РЭЧЫ З ГІСТОРЫЯЙ

Замак, які будуе Сяргей, прывязаў яго да маленькай вёсачкі Чухны. Гэты незвычайны будынак — галоўная славутасць акругі. Не лічачы, вядома, самога Крэўскага замка, які сёння ўяўляе сабой маляўнічыя руіны. У замку-арыгінале, да якога ад сядзібы Бандарэнкі можна дайсці пешшу, рэканструкцыя пакуль толькі пачынаецца, а яго копія на падворку мастака паступова і няўхільна набліжаецца да лагічнага завяршэння.

Маштаб замка — 1:10. Цаглінкі, з якіх ён складзены, Сяргей абпальвае ў печы сам: кожная цаглінка — дакладная копія тых, з якіх складзены арыгінал.

— Калі рабілі першую партыю цэглы, патрэбна была нейкая круглая лічба. Мы з жонкай узялі сапраўдную замкавую цэглу і паменшылі яе ў дзесяць разоў. Я ж не магнат — пабудаваць замак у натуральную велічыню. Ад гэтай ідэі, хоць і з жалем, але давялося адмовіцца. Селі мы тады з жонкай, падумалі. У маштабе адзін да двух — не пацягнем. Адзін да пяці — таксама не хопіць грошай. Ну, тады давай зробім замак у маштабе адзін да дзесяці. Гэты замак — наш з жонкай сумесны праект. Дарэчы, якраз тады, калі мы толькі думалі аб будаўніцтве замка, быў цікавы выпадак. Ехалі і слухалі ў дарозе «Радыё Гродна». А там навіна: знайшлі дзесьці скарб, які ацанілі ў пяць мільярдаў долараў. Мы з жонкай думаем: вось бы нам на агародзе каля нашай хаткі знайсці, напрыклад, скарб Напалеона! Прыйшоў бы я тады ў выканкам і сказаў: хачу выкупіць Крэўскі замак і сам яго аднавіць, па ўсіх гістарычных канонах! Добра, раз скарбу не знайшлі, сказала жонка, давай рабіць маленькі замак...

Ну, скарб не скарб, а сёе-тое са старажытнасцяў у майстэрні Бандарэнкі з'явілася — мясціны ж вакол гістарычныя, запаветныя і нават па адчуваннях нейкія казачныя. Ва ўласным агародзе майстар знайшоў іржавы штык напалеонаўскіх часоў. А ў склепе свайго дома — артылерыйскі ствол часоў Першай сусветнай. Мясцовыя жыхары спачатку глядзелі на незвычайных аднавяскоўцаў з асцярогай, але потым прынялі «дзіўных» суседзяў і нават сталі прыносіць ім старыя рэчы — раптам спатрэбяцца? Напрыклад, расказвае Сяргей, нядаўна прынеслі ўнікальны абраз XVIII стагоддзя.

— Бачыце, вось тут пацёртасць ад пальца, — паказвае Сяргей. — За гэты абраз шмат дзесяцігоддзяў, мабыць, хавалі грошы, а калі даставалі, увесь час браліся за адзін і той жа рог.

Рэчы з гісторыяй, як і гісторыя наогул — захапленне і любоў сям'і Бандарэнкаў. І, здаецца, тут ім дапамагае само гэта старажытнае, запаветнае месца, дзе яны пасяліліся. Напрыклад, за сваім домам Сяргей знайшоў велізарны валун з дзіўнай формы ямінкай — ці то след вытанчанай ножкі, ці то вока, ці то вуха. На Беларусі кажуць, што гэта ішла Божая Маці і пакінула след. Гэтыя камяні лічыліся святымі. Калі ў следзе запасілася дажджавая вада, ёй прыпісвалі магічную сілу.

— Мой знаёмы, выкладчык БНТУ і адзін з найлепшых у нашай краіне спецыялістаў па вывучэнні камянёў, прыязджаў глядзець наш валун і сказаў, што, магчыма, гэты камень быў паганскім алтаром, — кажа Сяргей. — Валун прыцягнула ледавіком са Скандынавіі. Таму я вырашыў, што на ім не след Божай Маці, а вуха Одзіна. Ён слухае, што тут адбываецца, на Крэўскай зямлі.

— Одзін — бог воінаў...

— А мы якраз і ваюем. З забыццём сваёй гісторыі, з абыякавасцю да яе.

Калі плануецца завяршэнне будаўніцтва замка, Сяргей адказаць пакуль не гатовы. Кажа, абавязацельствы «пяцігодку за тры гады» браць на сябе не хоча. Над замкам працуе дзень ці два на тыдзень. І многае ўжо зроблена. Але ж ёсць і іншыя творчыя праекты, якія таксама патрабуюць часу.

— Замак — дарагі праект?

— Не вельмі, калі расцягнуць выдаткі па часе. Да таго ж, мы эканомім як можам. Напрыклад, для работы па метале купляем абрэзкі, якія ідуць на металалом. І так шмат у чым. У Сярэднявеччы ж не існавала будаўнічых фірмаў і прадпрыемстваў па выпуску будаўнічых матэрыялаў — у справу ішлі матэрыялы, якімі былі багатыя наваколлі. Так што мы прытрымліваемся гістарычных прынцыпаў.

Дарэчы, у замку на падворку Бандарэнкаў ужо з'явіўся ўласны прывід. Па словах Сяргея, у адным з кутоў замкавага двара компас пачынае «вар'яцець».

— А чаму б і не? У Крэўскім замку адвеку «жыве» свой прывід — знакамітая дзяўчына з сабакам. Цяпер у яе «доме» рэканструкцыя. Трэба ж ёй дзесьці перачакаць «рамонт».

НЕТРАЯНСКІ КОНЬ І «ВОЛЬНЫЯ МУЛЯРЫ»

Сяргей не ўтойвае, што адна з галоўных мэт яго праекта — прыцягненне турыстаў. З гэтай жа мэтай хутка каля ўвахода ў сядзібу Бандарэнкаў з'явіцца скульптура воіна на кані. Конь (памерам з сапраўдную здаравенную жывёліну) ужо амаль гатовы, стаіць на сапраўдных падковах і шалёна косіць вокам на ўсіх, хто праходзіць міма. Турысты пагалоўна абзываюць яго «траянскім».

— Хутка давядзецца павесіць на нашага каня шыльду: «Гэта не траянскі конь, гэта конь Чухноўскі», — смяецца Сяргей.

— А хто будзе сядзець на гэтым кані? Вітаўт? Гедымін? Альгерд?

— Імя пакуль не выдаю. Няхай будзе сюрпрыз. Скажу толькі, гэта будзе сур'ёзны хлопец, у сапраўдных гістарычных даспехах і з мячом. Цэментны каркас будзе схаваны пакрыццём пад медзь, з пацінай. Сучасныя тэхналогіі дазваляюць зрабіць вельмі многае.

Турысты ў гэтую незвычайную сядзібу прыязджаюць кожны дзень. Часам — даволі вялікімі групамі, але часцей — сем'ямі. Убачылі сайт Сяргея — і захацелі паглядзець на «міні-замак» і іншыя славутасці сваімі вачыма.

— Учора, напрыклад, прыязджала сям'я. Муж — аўстрыйскі прадпрымальнік, а жонка — з Беларусі. Купілі ў нас некалькі работ.

Пражыць мастацтвам у наш час, вядома, нерэальна, кажа Сяргей. Жыць толькі творчасцю, на жаль, не атрымліваецца — даводзіцца думаць аб хлебе надзённым. Гэта раней у творцаў былі мецэнаты. Але свет не без добрых людзей і ў нашы дні.

— Калі была пандэмія і ўвялі масачны рэжым, у нас быў крызіс. Гэта было ў красавіку-маі. Перасталі ездзіць турысты, людзі баяліся лішні раз выйсці з дому. І раптам прыязджае турыст. Мы яму ўсё паказалі. Ён, сыходзячы, дастаў сто долараў і кажа: «Гэта вам на развіццё».

Экскурсіі па сваім замку і імправізаваным музеі-майстэрні Сяргей і Марына Бандарэнкі праводзяць бясплатна. Але просяць турыстаў купіць цаглінку з надпісам «Крэва» за сімвалічную суму.

— Свайго роду ўваходны квіток. Толькі не папяровы, а каменны. Мы ж вольныя муляры, — мой суразмоўца ківае на вежы і галерэю замка, складзеную з сотняў маленькіх цаглін. — Амаль што масоны.

У майстэрні Сяргея пачэснае месца займаюць копіі гістарычных рэчаў. Але яны здаюцца цікавымі далёка не ўсім, кажа суразмоўца.

— Напрыклад, вось беларускі «веджвуд», старадаўнія «пальцамі лепленыя» вазачкі. Часам турысты пытаюцца: а чаму вы не купіце сабе ганчарны круг? Навошта пальцамі ляпіць? Я адказваю: дык проста яго не вынайшлі яшчэ.

— А якое пытанне вам задаюць часцей за ўсё?

— «Вы не хочаце рэстаран тут у вас адкрыць?» Мне ўжо амаль 60, і я не хачу займацца рэстаранам. Гадоў у 30–40 можна было б аб гэтым падумаць, але не цяпер. Хоць у чымсьці турысты маюць рацыю. Бо ў Крэве, куды людзі часам прыязджаюць за сотні кіламетраў, нават няма дзе нармальна выпіць кавы. І калі рэканструкцыя замка завершыцца, гэта будзе недапушчальны прабел. Бо гістарычны аб'ект — гэта цэнтр «сонечнай сістэмы», вакол яго павінна быць сур'ёзная інфраструктура. Кафэ, рэстараны, гасцініца, пляцоўка для кемпінга, мастакі, музыкі і г. д. Тады гэта будзе па-сапраўднаму цікава турыстам.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

АДЗІНОКАЕ ЛЕТА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Алёна думала пра шасцігадовую сястрычку, туга па якой у прытулку абвастрылася. Калі яе бацька забраў дзяўчынку да сябе, маці перастала піць, уладкавалася на работу, і нейкі час здавалася, што жыццё наладжваецца. Але потым з'явіўся новы кавалер, і жанчына сарвалася: п'янкі ды высвятленні адносін паміж маці, яе сужыцелем і дзядулем Алены станавіліся ўсё больш частымі і жорсткімі. У школе ўсё цяжэй было рабіць выгляд, што ў яе нармальная сям'я.

У той дзень Алене не ўдалося разняць бойку паміж дарослымі. Дзяўчынка спалохалася і выклікала міліцыю. Яна сама напісала заяву і пагадзілася паехаць у прытулак. Маці хутка прыехала па дачку. Каб забраць яе, трэба было прайсці курс лячэння ў нарколага і ўладкавацца працаваць. У Алены быў рэальны шанц вярнуцца дадому. Заставалася пару тыдняў да шчаслівага моманту, калі ёй паведамілі, што маці зноў не прыйшла на работу. Дзяўчынка яшчэ спадзявалася, але неўзабаве стала вядома — маці запіла. Планы і мары падлетка сталі рассыпацца. Алёна часта плакала, але не страчвала надзеі. Прайшоў сакавік, красавік, надышоў май...

Маці Алены не здолела выправіць сітуацыю. Супрацоўнікі органаў апекі вымушаны былі падаць у суд на пазбаўленне яе бацькоўскіх правоў. Дзяўчынка пакіне часовы прытулак, але паедзе не дадому...

Калі Алена пачула ў судзе прызнанне маці ў тым, што кадзіраванне не дапамагло, і яна ўжо не можа кінуць піць, дзяўчынка расплакалася. На наступны дзень паведаміла супрацоўнікам СПЦ, што не жадае, каб яе ўдачарылі, — яна гэтак жа не хоча трапіць у прыёмную сям'ю. Алена абрала жыццё ў дзіцячым доме.

— Дзеці, старэйшыя за сем гадоў, ужо добра разумеюць, што адбываецца, — расказвае **намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце ДУА «СПЦ з прытулкам Ленінскага раёна г. Мінска» Ірына АСТАШКО.** — Яны да нас трапляюць вельмі стомленыя і ў надзвычай моцным стрэсе. З імі адразу пачынае працаваць псіхолаг. Мы расказваем дзецям пра ўмовы, якія павінны выканаць іх бацькі, і тлумачым чаму.

Органы апекі працуюць з бацькамі і дзецьмі прыкладна паўгода. І тым, і тым аказваецца псіхалагічная дапамога, супрацоўнікі накіроўваюць бацькоў да патрэбных спецыялістаў, падказваюць, куды звяртацца пры пэўных праблемах, бывае, нават дапамагаюць уладкавацца на работу. Сутыкаючыся з дзіцячым болем, работнікі робяць усё магчымае, каб у сям'і ўсё наладзілася. Калі ж бацькі не наведваюць дзяцей, не выконваюць рэкамендацыі спецыялістаў, то іх пазбаўляюць бацькоўскіх правоў, а дзіцяці знаходзяць новую сям'ю або адпраўляюць у інтэрнатную ўстанову.

Калі падчас знаходжання ў прытулку надыходзяць летнія канікулы, то дзяцей, старэйшых за 6 гадоў, адвозяць у дзіцячы аздараўленчы летнік. Там яны праводзяць дзве змены. Для многіх такі адпачынак — новы вопыт, і яны чакаюць яго з хваляваннем і цікаўнасцю. У летніку іх таксама могуць наведваць. Здараецца, што запыту на наведванне дзіцяці ў аздараўленчай установе няма, і тады супрацоўнікі СПЦ наведваюць дзіця самі.

Але сёлета ўсё не так — COVID-19 пазбавіў малых і гэтай магчымасці. Алёна трапіла ў аздараўленчы летнік разам з яшчэ васьмю дзецьмі з прытулку. Яна паехала, калі эмоцыі ўлегліся, з разуменнем таго, што па вяртанні яе адвязуць у спецыяльную ўстанову для дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.

Малыя таксама гаруюць

...Багдан з нараджэння быў «пры маці», як кажуць спецыялісты, і ў яго ўтварылася вельмі моцная, але трывожная прывязанасць. Калі дзіця прывезлі ў прытулак, ніхто не мог яго супакоіць. Трохгадовы хлопчык крычаў і клікаў маму ўвесь першы дзень, і другі, і трэці...

І вось Багдан дачакаўся. Маці павезла яго дадому першага чэрвеня. А праз дзесяць дзён яго, галоднага, зноў забралі ў прытулак. Калі малы зразумеў, куды яго прывезлі, то заматаў галавой і з адчайным крыкам пабег у супрацьлеглы бок калідора ад ужо знаёмай групы. У той дзень малы атрымаў у падарунак вялікую новую машынку, якую бераглі ў прытулку якраз для падобнага выпадку. Толькі тады Багдан пагадзіўся зайсці ў групу, дзе адразу паведаміў, што машынку яму падарыла маці.

...Мама Міхася ў адзінаццацігадовым узросце сама трапляла ў гэты прытулак. Цяпер у яе не вельмі атрымліваецца выконваць ролю маці. Яна цягала дзіця па прытонах раёна. Супрацоўнікі органаў апекі ўгаворвалі і прасілі яе адумацца, прапаноўвалі дапамогу. Не выйшла. Мішку давялося забраць і доўга лячыць ад розных хвароб. Ён таксама крычаў, але, у адрозненне ад Багдана, хутка прызвычаіўся да новых умоў і правіл. Мама Мішы хацела забраць яго, але нарадзіла дачку, і цяпер ёй быццам і не да сына. Супрацоўнікі СПЦ спадзяюцца, што хлопчыка ўсынавяць, бо такога добрага і шчырага яшчэ трэба пашукаць.

— У прытулак трапляюць дзеці з трох гадоў, — расказвае **педагог-псіхолаг Наталля СІТКАЛЕЕВА.** — Такіх маленькіх мы пераконваем, што ў нас вельмі цікавы садок, маўляў, там весела, шмат цацак, ты знойдзеш новых сяброў. Мы стараемся зняць напружанне праз гульню, усмешку, папесціць ды супакоіць. Дзеці, якія адаптаваліся да сітуацыі, прыходзяць на дапамогу пры з'яўленні новенькіх. Яны як ніхто іншы могуць зразумець і прыняць тыя пачуцці, што адчуваюць малыя ў гэты момант. Дзеці дашкольнага ўзросту звычайна даволі хутка прывыкаюць да рэжыму ў прытулку, які арганізаваны прыкладна як у дзіцячым садку, становяцца больш спакойныя і хутка даганяюць па развіцці сваіх аднагодкаў. Малыя, як і больш дарослыя дзеці, чакаюць прыходу сваіх мам і татаў ды спадзяюцца на хуткае вяртанне дадому.

Дашкаляты не ездзяць у аздараўленчыя летнікі, яны застаюцца ў прытулку на ўсё лета. Але звычайна дзеці рэдка праводзяць цэлы дзень ва ўстанове, а наведваюць музеі, кінатэатры, тэатры, заапаркі. Малым летам у самім СПЦ ладзяць розныя святы, запрашаюць аніматараў, арганізуюць навуковыя шоу, «дні Нептуна» на вуліцы, ходзяць з імі на пікнікі, увогуле стараюцца, каб дзеці больш знаходзіліся на свежым паветры.

— З-за распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі нам давялося карэкціраваць работу прытулку, — расказала **дырэктар СПЦ Аксана ГОВЕН.** — Яшчэ вясной мы прынялі рашэнне не вадзіць нашых старэйшых дзяцей у школу, а перавесці іх на дыстанцыйнае навучанне. Гэта было сапраўднае выпрабаванне для нашых дзяцей і педагогаў. Але ў выніку дзякуючы настаўнікам, якія працавалі анлайн, справіліся. Мы перасталі наведваць грамадскія месцы ў Мінску, але ад летніка не адмовіліся. Дзеці звычайна прыязджаюць пасля яго добра адпачыўшы. Набрацца сіл летам вельмі важна для іх. Дашкольнікаў забаўляем самі. У нас творчы калектыў прафесіяналаў — нядрэнна атрымліваюцца святы, канцэрты, шоу. Учора вадзілі дзяцей на рэчку карміць качак — столькі захаплення! Хадзілі пешшу, гэта недалёка, малыя вытрымліваюць. На транспарце нікуды не ездзім: у нас даволі вялікая тэрыторыя, і дзецям ёсць дзе ўдосталь пагуляць.

Дырэктар падчас экскурсіі па прытулку расказала, што прыборка і раней рабілася часта. Цяпер асаблівую ўвагу звяртаюць на апрацоўку дзвярных ручак і іншых паверхняў. Трэнажорная зала, сталоўка, пральня, гардэроб, пакоі для малых, пакоі для старэйшых, ванныя пакоі, гульнявыя, клас для самападрыхтоўкі, камп'ютарны клас, пакой сустрэч з бацькамі, пакой для наладжвання добрых адносін паміж дзецьмі і бацькамі ў прысутнасці псіхолага... Усюды чысціня і парадак. Пра тое, што гэта не садок, сведчыць сушылка для бялізны з дзіцячым адзеннем розных памераў: майкі, шорты, сукенкі, шкарпэткі...

Раптам будынак напоўніўся дзіцячым гулам. Дашкольнікі вярнуліся з прагулкі. Яны беглі па лесвіцы на другі паверх, не звяртаючы на мяне ўвагі. Калі натоўп малых знік, я ўбачыла адзінокую фігурку хлопчыка гадоў чатырох, які не пабег за астатнімі, а сеў на лесвіцы.

— У мяне вось тут «боля», — паведаміў малы, калі заўважыў, што я зацікавілася.

Аказалася, гэта Мішка. Ён падрапаў каленку. Я сфатаграфавала ранку і разам з ім стала разглядаць яе ў павялічаным памеры на тэлефоне. Мы вырашылі, што тут можа дапамагчы медсястра, у якой, напэўна, ёсць «чароўны пластыр». Малыш павесялеў і адправіўся лячыць ножку. Я вярнулася ў групу. Там Багдан у адзіноце гуляў са сваёй машынкай. Дзяніс з сястрой Ганнай, шасці і пяці гадоў, вырашылі, што чужы чалавек ім перашкаджае. У іх напярэдзе яшчэ палова лета трывожнага чакання.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

УНП 790613326

ОТЧЕТ
Местного благотворительного фонда
«Возрождение историко-культурных ценностей Шкловского района»
об использовании своего имущества за 2019 год

Местный благотворительный фонд «Возрождение историко-культурных ценностей Шкловского района» информирует о продолжении своей деятельности согласно Уставу и располагается по адресу: 213004, Республика Беларусь, Могилевская область, город Шклов, ул. Ленинская, дом 49.

1. Учредители фонда: Дедков Алексей Владимирович; Дроздова Ирина Александровна; Еремич Николай Григорьевич; Марфель Галина Васильевна; Пименов Александр Александрович; Сергеенко Светлана Федоровна; Силивестрова Лариса Валентиновна; Тарасова Екатерина Александровна; Шинкевич Галина Валерьевна.

2. Информация о стоимости имущества фонда:

Имущество, переданное фонду его учредителями – нет.

Доходы полученные от добровольных взносов и пожертвований граждан и организаций – 764 404, 41 (семьсот шестьдесят четыре тысячи четыреста четыре российских рубля 41 копейка).

Доходы, полученные от осуществляемой в соответствии с уставом предпринимательской деятельности – нет.

Иные, не запрещенные законодательством , поступления – нет.

3. Информация об общей сумме расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе:

расходы фонда, не запрещенные законодательством Республики Беларусь – 764 404, 41 (семьсот шестьдесят четыре тысячи четыреста четыре российских рубля 41 копейка).

4. Фонд не является учредителем унитарных предприятий, хозяйственных обществ и не участвует в создании других юридических лиц.

Закрытое акционерное общество «Смолевичи Молоко»
(местонахождение:
222201, Минская обл., Смолевичский р-н, г. Смолевичи, ул. Социалистическая, д. 54 б)
сообщает, что директором ЗАО «Смолевичи Молоко» 30.07.2020 г.
принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг.
Формирование реестра акционеров осуществляется по состоянию на 30.07.2020 г.

УНП 690698083.

ЗАСО «Промтрансинвест» предлагает принять участие в процедуре закупки компьютерной техники № 2020-827197, размещенной на сайте http://www.icetrade.by по «Компьютеры / оборудование > Другое».

УНП 100357923.

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

13 августа 2020 года на 12-м открытом аукционе проводит 11-й от 30 июля 2020 года повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номер лота	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи *(бел. руб.)*	Сумма задатка *(бел. руб.)*
109	Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном ДФ-3 в составе: кузов-фургон ДФ-3, № 9197, 1987 г., *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66, ш. 0454304, дв. 95531, 1986 г., *4 кат., 3512 км*	г. Осиповичи, в/ч 01313	3 600,00	720,00
118	Автошасси Урал-4320-00, ш. Н0087771, дв. 311785, 1987 г., *4 кат., 68705 км*	г. Старые Дороги, в/ч 48668	7 500,00	1 500,00

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 13 августа 2020 г. в 10.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 10 августа 2020 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **13 августа 2020 г. с 9.00 до 9.45.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусского рубля за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ», № 30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел/факс: (017) 398 05 41.

Ранее опубликованное извещение в газете «Звязда» № 121 от 24.06.20 г.

«БЫЛІ МУЖЧЫНЫ, ЯКІХ РЭАЛЬНА ЗАКРАНАЛА МАЯ ГУЛЬНЯ»

Як дзяўчына выступае ў аматарскай хакейнай лізе супраць мужчын і адкрывае свае асаблівыя трэнажорныя залы

Наталля АЛЯКСЕЕНКА — дзяўчына нетыповая: у дзяцінстве яна не марыла стаць балерынай або гімнасткай, хоць яе і цікавіў спорт. Спачатку Наташа стала займацца каратэ і дасягнула там значнага поспеху, неаднаразова стаўшы чэмпіёнкай Беларусі. Потым яе зацікавіў хакей, і яна трапіла ў адзіную ў краіне жаночую хакейную каманду «Пантэры». Разам з дзяўчатамі гэтай лядовай дружыны Наталля паспела выйграць некалькі міжнародных тытулаў, але з часам каманда распалася. Дзяўчына не разгубілася, перайшоўшы на аматарскі ўзровень, але цяпер яна гуляе ў адзін з самых жорсткіх відаў спорту з мужчынамі. А наступным неардынарным крокам Наталлі стала адкрыццё эксклюзіўнай студыі для персанальных трэніровак Vip Gym, дзе кліенты могуць займацца ў трэнажорнай зале па адным, без старонніх вачэй і дакучлівых дарадчыкаў. Пра свае нежаночыя захапленні і ўнікальную трэнажорную залу расказала ў інтэрв'ю.

«Не заўважаючы хвосцік, які тырчыць з-пад шлема, маглі ўдарыць»

«Я на здзіўленне была спакойным дзіцём, але калі мне чагосьці хацелася, то пераканаць у адваротным было вельмі складана», — успамінае сваё дзяцінства Наташа. Спачатку ёй захацелася займацца каратэ. Каб уламаць на гэта бацькоў, сышло два гады. «Але мне здавалася, што гэта суперспорт, таму вельмі хацелася туды трапіць», — кажа дзяўчына. А потым яна «захварэла» на хакей.

— У гадоў 9-10 мы з татам трапілі на аматарскі прэзідэнцкі турнір, і мне так спадабалася ўсё, што адбывалася на лёдзе, што захацелася навучыцца катацца на каньках. Вучыцца давялося самой, таму што ўзрост для дзіцячых секцый быў ужо непрыдатны. Хадзілі з татам на масавыя катанні, я заставалася на 2-3 сеансы запар. А потым даведалася пра тое, што ў нас у краіне стварылі жаночую каманду, і вырашыла туды трапіць.

Жаночая хакейная каманда «Пантэры» праіснавала ў Беларусі нядоўга, з 2011 да 2013 года, але за гэты час дзяўчаты паспелі стаць пераможніцамі некалькіх міжнародных еўрапейскіх турніраў, абыграўшы ў тым ліку і прызнаныя хакейныя дзяржавы.

— У параўнанні з мужчынскім хакеем у нас былі вельмі добрыя дасягненні. Але каманда распалася ад таго, што мы не знайшлі для яе спонсараў, — тлумачыць Наталля. — А наогул жаночы хакей — гэта цікава, відовішна, эмоцыі зашкальваюць. Камандны дух, атрыманы там, мне вельмі спатрэбіўся ў жыцці: пабываўшы ў такім калектыве і ў такой гульні, ты пачынаеш цаніць сапраўдную дружбу і падтрымку, якія паводле стэрэатыпа не ўласцівыя жанчынам.

Пасля таго як каманда распалася, хтосьці з дзяўчат з'ехаў гуляць за мяжу, хтосьці адправіўся на сваю малую радзіму, а Наталля занялася хакеем для душы, але ўжо ў мужчынскім калектыве.

— Вядома, хацелася б большага, але застаецца толькі бегаць з мужыкамі па вечарах. За медалькі змагацца мне ўжо не вельмі цікава, а вось выказаць на лёдзе эмоцыі — люблю.

Наташа адзначае, што спачатку сутыкалася з рознымі рэакцыямі ад гульцоў мужчынскага полу, але цяпер да яе ўсе ўжо прывыклі.

— Зараз ставяцца да мяне паважліва, без якіх-небудзь наездаў. Калі нейкія пытанні з раздзяваль-няй, лішні раз падыдуць, даведаюцца, ці патрэбны мне асобны пакой, а калі такой магчымасці няма, то спакойна дадуць пераадзецца спачатку мне, потым робяць гэта самі. А ў пачатку здаралася па-рознаму, — былі мужчыны, якіх рэальна закранала мая гульня. Напэўна, яны не маглі зразумець, што дзяўчына таксама можа нядрэнна гуляць у хакей і нават рабіць гэта лепш за іх. Я лічу, што ў такіх мужчынах гуляе нешта нездаровае і яны спрабавалі неяк адпомсціць, спагнаць сваю злосць. Нібыта не заўважаючы хвосцік, які тырчыць з-пад шлема, маглі моцна ўдарыць, як бы па правілах, але можна было абысціся і без гэтага. З часам я зразумела, што такія людзі будуць заўсёды, але не варта звяртаць на іх увагу. Трэба сказаць, што за мяне заступаліся іншыя хлопцы з каманды і тлумачылі не цалкам адэкватным, што трэба было б мякчэй.

Наталля Аляксеенка спадзяецца, што жаночы хакей рана ці позна вернецца ў Беларусь, і кажа, што не супраць дапамагчы ў яго развіцці сваім вопытам і работай.

— З моманту распаду каманды прайшло ўжо шмат часу. Напэўна, складана будзе вярнуцца ў тую ж форму, але ўсё залежыць ад абставін. Думаю, калі такая каманда з'явіцца, нейкім чынам я змагу паўдзельнічаць у яе развіцці, можа быць, дапамагу ў фізпадрыхтоўцы хакеістак, стану трэнерам, але як гулец, напэўна, ужо наўрад ці рэалізую сябе. На самай справе дзяўчат, якія жадаюць гуляць у хакей, шмат. Галоўнае, каб жаночы хакей быў падтрыманы дзяржавай, ствараліся школы, у якіх дзяўчынкі маглі б навучацца з нуля. І толькі пасля гэтага варта збіраць нармальную дарослую каманду.

«Першымі кліентамі былі людзі, якія любяць камфорт»

Цяпер Наталля працягвае вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры, яе спецыяльнасць — трэнер па хакеі. Акрамя ўніверсітэцкай адукацыі яна прайшла мноства курсаў і стала сертыфікаваным трэнерам трэнажорнай залы, а таксама інструктарам TRX. Пасля таго як дзяўчына папрацавала ў буйных фітнес-цэнтрах і залах, убачыла там пэўныя недахопы, яна вырашыла сама адкрыць трэнажорную залу, але незвычайную.

— Па маіх назіраннях, у трэнажорную залу звычайна прыходзяць людзі, незадаволеныя сабой. Часта яны камплексуюць з нагоды таго, што падчас заняткаў на іх хтосьці глядзіць, і на самай справе такое бывае. Да таго ж у вялікіх залах патрэбныя трэнажоры часта занятыя, і гэта таксама шмат каму дастаўляе дыскамфорт. Я села і падумала, што трэба звычайнаму чалавеку, які проста хоча трымаць сябе ў форме? Па сутнасці, усяго пару шматфункцыянальных трэнажораў і добры трэнер. Гэта ўжо для тых, хто выступае прафесійна, патрэбныя вялізныя вагі, спецыяльныя трэнажоры, якія мацуюць глыбокія мышцы, але большасці гэта ні да чаго.

Пасля таго як Наташа зразумела, што ідэя так званых віп-залаў цікавая не толькі ёй, дзяўчына пачала дзейнічаць. Яна вырашыла стварыць невялікую трэнажорную залу з некалькімі шматфункцыянальнымі трэнажорамі і іншымі прыстасаваннямі, якія патрабуюцца для трэніровак. Плошча першай «трэнажоркі» склала ўсяго 35 квадратных метраў, а «фішка» заключалася ў тым, што тут людзі змаглі займацца сам-насам з трэнерам або зусім у поўнай адзіноце, не адцягваючыся на староннiх. Стварацъ «асаблівую» залу Наташы дапамагаў тата.

— Для першай залы нам спатрэбілася літаральна некалькі шматфункцыянальных трэнажораў, але яны павінны быць падабраныя правільна, каб іх функцыі не паўтараліся. І самае галоўнае — добры, адукаваны трэнер, які падбярэ правільную нагрузку, зможа знайсці падыход да сарамлівага чалавека, дасць яму зразумець, што тут будзе камфортна. Што датычыцца папяровых пытанняў — бухгалтэрыі і падатковай, — паволі разабралася сама, бо калі ёсць жаданне, абавязкова ўсё атрымаецца. Я адкрыла першую залу, калі мне быў усяго 21 год. Было страшна? Не! Калі гэта робіш з душой і амбіцыямі, яно не можа не спрацаваць. Я нават думак не дапускала, што нешта можа не атрымацца, хоць многія глядзелі на гэта скептычна і я была гатовая да такой рэакцыі. Калі выходзілі першыя навіны пра маю справу, было шмат негатыўных каментарыяў. Я не думала, што ў нас людзі настолькі не ўмеюць радавацца за іншых і ім так складана прыняць нешта новае. Разам з тым паступалі і добрыя пажаданні, кліенты пачалі тэлефанаваць, тэлефанаваць, тэлефанаваць, такая індывідуальная трэнажорная зала аказалася вельмі запатрабаваная.

Наталля расказвае, што першымі яе кліентамі сталі людзі, якія саромеліся сваёй знешнасці і любілі камфорт.

— Камусьці хочацца ўключыць менавіта сваю музыку і не адцягвацца на іншых людзей, бо ў звычайнай зале тыя, хто працуе з вялікімі вагамі, могуць пакрычаць, пагыркаць, не ўсякі чалавек выконвае гігіену, а галоўнае — людзям заўсёды падабаецца індывідуальны падыход, каб на занятку было не два, тры і больш чалавек, а толькі ён адзін. Да таго ж вельмі важная ўвага трэнера — трэба сачыць за тэхнікай, каб пазбегнуць траўмаў.

З часам попыт на такі варыянт залы стаў толькі павялічвацца. Цяпер у Наталлі Аляксеенка іх ужо дзве. Сёння яе кліенты — гэта і мужчыны, і жанчыны самых розных узростаў.

— Я вельмі рада пашырэнню, але, вядома, гэта дадало і галаўнога болю. Цяпер адна я ўжо не спраўляюся, таму давялося шукаць іншых трэнераў, а гэта аказалася нялёгка. Я праглядала шмат людзей, былі вопытныя трэнеры, але яны б не змаглі доўга працаваць у такім фармаце, таму што гэта дзеючыя спартсмены, якім больш падыходзіць работа з прафесіяналамі. Былі людзі, якія толькі-толькі скончылі двухдзённыя курсы, але і гэта таксама не выйсце.

На трэнажорных залах арыгінальныя ідэі Наталлі не вычарпаліся: сёння яна абдумвае ўжо новы праект, які датычыцца спорту і IT-тэхналогій, але пакуль трымае сваю задумку ў тайне.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ і з асабістага архіва гераіні.

На скрыжаваннях гісторыі

ПА ТОЙ БОК ЖЫЦЦЯ

У Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Нясвіж» 1 жніўня стартуе ўнікальная выстаўка «Пахавальныя традыцыі Радзівілаў».

— Перш чым расказаць аб экспазіцыі, варта нагадаць, якія падзеі гэтаму папярэднічалі, — кажа **дырэктар музея-запаведніка Сяргей КЛІМАЎ.** — Два гады таму мы разам з літоўскімі калегамі правялі даследаванне крыпты і астанкаў прадстаўнікоў роду Радзівілаў пад касцёлам Божага Цела. Там трымалася вялікая вільготнасць, і трэба было вызначыцца, што рабіць далей на ўзроўні хоць бы рэкамендацый рэстаўрацыі. Адкрылі некалькі саркафагаў. Аказалася, што вада трапляла не толькі на сцены ўсыпальніцы, але і ўнутр саркафагаў. Астанкі некаторых Радзівілаў былі пашкоджаны. Практычна нічога не засталося ад мумій Пане Каханку, Рыбанькі, Уршулі Радзівіл. Захаваліся толькі некаторыя фрагменты іх адзення. Зразумела, тыя рэчы, якія суправаджалі Радзівілаў у іншы свет, мы не маглі пакінуць там, бо праз колькі гадоў яны ператварыліся б у пыл. Па рашэнні Нясвіжскага райвыканкама, як уласніка гэтых памяшканняў, рэчы былі выняты. А на сесіі райсавета дэпутаты далі згоду на тое, каб яны ўвайшлі ў музейны фонд краіны. Усяго ж дасталі адтуль звыш 90 прадметаў, частку з іх адрэстаўрыравалі ў Літве. Пад гэтыя прадметы і рабілася экспазіцыя на грошы Міністэрства культуры, Еўрасаюза (сумесны грант для Літвы, Латвіі і Беларусі), а таксама нашы ўласныя сродкі.

Экспазіцыя практычна ўжо на выхадзе, засталіся дробязі. Падчас даследавання гісторыкі выявілі малавядомы раней факт, што Радзівілы прэтэндавалі на каралеўскія ўшанаванні, паколькі былі князямі Свяшчэннай Рымскай імперыі. І пахавальны цырыманіял узяты з аналагічнага цырыманіялу. Менавіта так хавалі рымскіх імператараў, а затым — каралёў і князёў у Еўропе. Гэта быў складаны, нават не разавы рытуал, а шматмесячная працэдура ў сувязі з тым, што Радзівілы са смерцю ўваходзілі ў арэол славы. Ім як бы аддавалася пашана за ўсе іх зямныя справы. Для хрысціяніна — як каталіка, так і праваслаўнага — факту адыходу ў іншы свет аддавалася вялікая ўвага, да гэтага яны рыхтаваліся яшчэ пры жыцці. Існаваў цэлы рытуал: як хаваць, у чым, якія абрады праводзіць.

— Аб гэтай культуры мы мала ведаем. І для нас важна не тое, што працэдура пахавання была пышная, урачыстая, а тое, што мы даведваемся аб паўсядзённым жыцці тагачасных людзей. У гэтым выпадку арыстакратаў, прадстаўнікоў магнацкага роду. Што набліжае нас да гісторыі, і мы лепш разумеем, што за людзі былі ў мінулым, якая ў іх была матывацыя, як яны жылі, як паміралі, — лічыць Сяргей Клімаў.

— Якія прадметы клалі ў труну Радзівілам?

— Па-рознаму. Напрыклад, Рыбанька быў гетманам, меў звычайную баявую шаблю «Карабэла». Ад яе ацалела некалькі асобных фрагментаў. Але нашы літоўскія калегі, да якіх мы звярнуліся, іх склеілі. У Пане Каханку захавалася толькі частка літога залатога пояса, вельмі дарагога і рэдкага. На сусветных аўкцыёнах ён надзвычай цэніцца, — расказвае Сяргей Міхайлавіч. — У 50-я гады мінулага стагоддзя ў крыпце праводзіліся даследаванні. Магчыма спецыялісты шукалі сакрэты бальзамавання для наступнага выкарыстання ў Савецкім Саюзе. Так яно ці не, цяпер цяжка сказаць. Аднак, паводле афіцыйнай версіі, гэта былі даследаванні на прадмет з'яўлення там мікраарганізмаў, які могуць выклікаць эпідэмію. Можа, тады пояс і быў разрэзаны на асобныя часткі. У саркафагах пад касцёлам Божага Цела нічога каштоўнага не знаходзілі, акрамя рэчаў, якімі людзі карысталіся ў жыцці, і яны — найбольш важныя артэфакты нашай экспазіцыі, якую рыхтуем. Дарэчы, у 1913 годзе частку саркафагаў адкрывалі самі Радзівілы, пра што сведчыць той факт, што драўляная труна была перавязана дротам і апячатана пломбай са свінцовай пячаткай магнацкага роду.

— Паводле апошняй інвентарызацыі 1999 года, у крыпце знаходзяцца 70 саркафагаў, дзве канопы (сасуды з бальзамаванымі вантробамі нябожчыкаў) і адна урна з прахам, — тлумачыць **старшы навуковы супрацоўнік музея-запаведніка Андрэй БЛІНЕЦ.** — Адметнасць касцёла Божага Цела ў тым, што ён увесь час заставаўся дзейным. Богаслужэнні тут не перапыняліся на працягу ўсіх 400 гадоў. Праходзілі набажэнствы і пры Радзівілах, і пры Расійскай імперыі, калі касцёлы закрываліся і перабудоўваліся ў праваслаўныя храмы, і пры другой Рэчы Паспалітай, і ў савецкі час, працуе ён і цяпер. Ні ў склады, ні ў гаспадарчыя памяшканні святыню не перабудоўвалі.

— Магчыма, таму і радавы склеп захаваўся?

— Бяспрэчна, касцёл і крыпта — часткі аднаго цэлага. Іх нельга падзяляць, без касцёла не было б і крыпты, а крыпты без касцёла. А што датычыцца традыцый пахавання, то давайце разважаць часавымі рамкамі. За чатыры стагоддзі любы звычай змяняецца, любая традыцыя эвалюцыянуе. Тое, што было прымальнае для XVII стагоддзя, непрымальнае для XX і наадварот. Таму казаць пра адзіныя пахавальныя рытуалы, якія былі б нязменныя пры пахаванні, мы не можам. Кожны раз цырымоніі адбываліся па-рознаму, у адпаведнасці з культурным кантэкстам, традыцыямі, поглядамі людзей таго ці іншага часу.

Самае першае пахаванне, якое дакладна задакументавана, — гэта пахаванне будаўніка касцёла Мікалая Кшыштофа Радзівіла Сіроткі ў 1616 годзе. Дык вось ён загадаў хаваць яго без лішняй помпы, у сціплым убранні пілігрыма, а каб труну неслі жабракі, якіх князь называў сваімі братамі. Ні пышных катафалкаў, ні гучных прамоў. Перад абліччам смерці ты не князь, не рыцар, не ардынат, а толькі пілігрым, які прыйшоў у гэты свет і адыходзіць з яго.

— У XVIII стагоддзі ўжо была зусім іншая традыцыя. Пахавальная цырымонія магла расцягвацца на тыдні і нават месяцы. Для яе ствараліся адмысловыя катафалкі, збіраліся велічныя пахавальныя працэсіі, — расказвае Андрэй Уладзіміравіч. — Катафалк з целам нябожчыка або нябожчыцы месяцамі аб'язджаў усе ўладанні, радавыя сядзібы, мястэчкі, за ім ішла вялікая жалобная працэсія з блізкіх, купцоў, рамеснікаў, вышэйшых слаёў гарадскога насельніцтва, жаўнераў-афіцэраў радзівілаўскай арміі. Паўсюдна адбываліся жалобныя набажэнствы. Затым памерлага прывозілі ў Нясвіж і змяшчалі ў касцёл у пабудаваны ўнутраны храм, так званы замак смутку. Туды ставілі труну, і яшчэ некалькі дзён гучалі прамовы, богаслужэнні, білі ў званы, давалі гарматныя залпы. Прыступкі былі выкладзены сотнямі метраў аксаміту, у касцёле і на падыходзе да яго гарэлі тысячы свечак. Па ўсім горадзе былі абсталяваны жалобныя развітальныя аркі. І толькі пасля гэтага цела апускалі ў радзівілаўскую крыпту.

У XIX стагоддзі, калі замак быў пусты, закінуты, стаяў без гаспадароў, нябожчыкаў проста прывозілі ў касцёл і пасля службы апускалі труну ў крыпту, затым адбывалася памінальная вячэра ў замку.

«Аб гэтай культуры мы мала ведаем. І для нас важна не тое, што працэдура пахавання была пышная, урачыстая, а тое, што мы даведваемся аб паўсядзённым жыцці тагачасных людзей. У гэтым выпадку арыстакратаў, прадстаўнікоў магнацкага роду. Што набліжае нас да гісторыі, і мы лепш разумеем, якія былі людзі ў мінулым, якая ў іх была матывацыя, як яны жылі, як паміралі».

У XX стагоддзі было зладжана пышнае пахаванне толькі Альберта Антонія Радзівіла ў 1936 годзе. Ён памёр у снежні 1935-га, але хавалі яго крыху пазней. На цырымонію з'ехалася амаль што ўся арыстакратычная эліта Рэчы Паспалітай, прадстаўнікі мясцовага свету, духавенства, ганаровая варта ад палкоў Войска польскага, з якімі князь быў так ці інакш звязаны. Гэта апошні раз, калі замак прымаў вялікую колькасць гасцей. Служба адбывалася ў Замкавай капліцы, а труну адтуль выносілі гаёвыя (егеры).

— А самае апошняе пахаванне прайшло летам 2000 года, калі урну з прахам Антонія Радзівіла прывезлі ў Нясвіж. Усё было ў традыцыях нашага часу — развітальныя прамовы, канцэрт-рэквіем. Таму казаць пра нейкую стандартную схему пахавання магнацкага роду нельга, — падсумаваў напрыканцы Андрэй Блінец.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
Фота з сайта mlyn.by

Далучайцеся!

З ЛЮБОЎЮ ДА МАЛОЙ РАДЗІМЫ

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі дае старт агульнарэспубліканскай творчай акцыі «За што я люблю родную зямлю». Яна прымеркавана да Дня беларускага пісьменства (свята адбудзецца ў верасні, сёлета — у горадзе Бялынічы Магілёўскай вобласці).

У рамках праекта кожны беларус зможа прадставіць сваю творчую работу (сачыненне, верш, апавяданне, эсэ, нарыс ці нешта іншае на беларускай мове), у якіх распавядзе пра галоўныя дасягненні ў развіцці сваёй мясцовасці, а таксама падзеліцца тым, што выклікае пачуццё гонару і любові да сваёй малой радзімы, яе гераічнага мінулага і славутага цяперашняга. Як вядома, 2020 год завяршае перыяд, які па рашэнні Прэзідэнта Беларусі быў абвешчаны ў нашай краіне Годам малой радзімы. За тры гады акцыі былі праведзены тысячы мерапрыемстваў па развіцці і добраўпарадкаванні населеных пунктаў у розных рэгіёнах краіны, па павышэнні ўзроўню культуры і духоўнасці беларускага народа, захаванні мясцовых традыцый, адметных рыс побыту народа, яго этнаграфічнай культуры і мовы.

— Ідэя акцыі, можна сказаць, належала кіраўніку нашай дзяржавы, калі аб'яўлялі Год малой радзімы з мэтай стымулявання сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў, фарміравання грамадзянскай пазіцыі і захавання гісторыка-культурнай спадчыны рэгіёнаў. А мэтай нашай акцыі з'яўляецца працяг гэтай агульнай задачы. Вышэй акрэсленая ідэя за тры гады ўвасобілася ў шматлікіх праектах, конкурсах, творчых работах. А наш конкурс — гэта своеасаблівы творчы акорд, як падвядзенне вынікаў, прымеркаванае да Дня беларускага пісьменства. Тым больш што напярэдадні ў нас будзе праводзіцца Тыдзень мастацкага слова, дзе плануюцца розныя мерапрыемствы. І будзе лагічна, калі мы падвядзём вынікі нашага творчага конкурсу і запросім яго пераможцаў на мерапрыемства ў Бялынічы. Разам з тым хочацца абудзіць грамадскую думку, каб людзі яшчэ раз задумаліся, наколькі ўнікальная і самабытная зямля, на якой мы жывём. Бо кожны рэгіён па-свойму непаўторны і ў гістарычным, і ў культурным плане, і за кожным стаіць праца самаадданых людзей. Нашай акцыяй мы жадаем актывізаваць творчасць беларусаў, каб яны падзяліліся сваімі аповедамі з гэтай нагоды, — адзначае **дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Ігар КАПЫЛОЎ.**

Свае работы ў рамках акцыі «За што я люблю родную зямлю» трэба прадставіць да 23 жніўня. Твор можа быць напісаны як адным чалавекам, так і ў суаўтарстве, але важна, каб раней ваша праца нідзе да гэтага не публікавалася. Ваша грамадзянства і месца пражывання не абмяжоўваюць магчымасць падзяліцца сваімі роздумамі і высновамі. Для разважанняў прапаноўваюцца наступныя тэмы: «За што я люблю свой край», «Мова маёй малой радзімы», «Родная зямля — крыніца натхнення», «Квітней, мая радзіма!». Ацэнку прадстаўленых твораў будуць праводзіць супрацоўнікі Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі. Найважнейшымі крытэрыямі ацэнкі заяўленых конкурсных работ будуць адпаведнасць заяўленай тэме, грамадская актуальнасць, арыгінальнасць, мастацкі ўзровень і дасканаласць мовы. Аб'ём аўтарскіх разважанняў — да 10 друкаваных старонак. Пазначаюцца ўзрост, месца працы (альбо вучобы) аўтара. Найлепшыя творы будуць у далейшым апублікаваны асобным зборнікам. А ўзнагароды знойдуць сваіх герояў падчас мерапрыемстваў Тыдня мастацкага слова, які будзе праводзіцца на базе НАН Беларусі з 31 жніўня да 6 верасня бягучага года, а таксама ў рамках Дня беларускага пісьменства.

Даслаць свае думкі па абранай тэме, аформленыя ў тым альбо іншым жанры, трэба да 20 жніўня на адрас: Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа, вул. Сурганава, 1/2, г. Мінск, 220072; альбо на электронную пошту inlinasbel@tut.by з паметкай «Конкурс».

Алена ДРАПКО.

У НОВАЙ РЭЧАІСНАСЦІ

Што прынясе штучны інтэлект?

ЮНЕСКА правяла глабальную анлайн-кансультацыю па этычных аспектах штучнага інтэлекту. У кожнага жыхара планеты была магчымасць далучыцца да работы міжнароднай спецыяльнай групы экспертаў. «Вельмі важна, каб у гэтай кансультацыі ўзяла ўдзел як мага большая колькасць людзей, былі ўлічаны меркаванні з усяго свету», — падкрэсліла генеральны дырэктар ЮНЕСКА Одры Азулай. Спецыяльнай групе экспертаў, у якую ўваходзяць 24 вядомыя спецыялісты, даручана падрыхтаваць першапачатковы варыянт праекта рэкамендацый. Ён будзе прадстаўлены на разгляд дзяржавам-членам падчас 41-й сесіі генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА ў лістападзе 2021 года. У выпадку прыняцця гэты праект стане першым глабальным нарматыўным дакументам, прысвечаным развіццю і выкарыстанню штучнага інтэлекту. Чаму наспела такая неабходнасць?

Рэсурс на 16 трыльёнаў долараў

Пасля Другой сусветнай вайны некалькі чалавек пачалі незалежна працаваць над інтэлектуальнымі машынамі. Англійскі матэматык Алан Цьюрынг, магчыма, быў найбольш вядомым прадвеснікам. Ён прачытаў сваю тэматычную лекцыю ў 1947 годзе. Цьюрынг адзін з першых вырашыў, што штучны інтэлект (artificial intelligence — AI) лепш за ўсё даследаваць шляхам праграмавання камп'ютараў, а не канструявання машын.

AI як галіна навукі вядзе адлік з 1956 года. Гэты кірунак быў агучаны на летнім семінары ў Дартмут-каледжы (Хановер, ЗША), які арганізавалі чацвёра амерыканскіх навукоўцаў: Джон Мак-Карці, Марвін Мінскі, Натаніэль Рочэстэр і Клод Шэнан. З тых часоў тэрмін «штучны інтэлект», прыдуманы, хутчэй за ўсё, з мэтай прыцягнення ўсеагульнай увагі, стаў настолькі папулярны, што сёння наўрад ці можна сустрэць чалавека, які пра яго не чуў. З цягам часу гэты раздзел інфарматыкі развіваўся ўсё больш актыўна, а інтэлектуальныя тэхналогіі ў апошнія шэсцьдзясят гадоў адыгрывалі важную ролю ў змене аблічча свету, адзначыў у сваім артыкуле на сайце unesco.org выкладчык інфарматыкі ва ўніверсітэце Сарбона Жан-Габрыэль Ганасія.

Укараненне тэхналогій штучнага інтэлекту ва ўсе сферы жыцця ў найбліжэйшыя 20 гадоў, паводле прагнозу глабальнага інстытута McKinsey, створыць новую рэчаіснасць. Разумная аўтаматызацыя можа быць супастаўная з маштабамі апошняй прамысловай рэвалюцыі. Цяперашнюю сітуацыю ў стратэгічнай галіне акрэслілі на Сусветнай канферэнцыі па штучным інтэлекце (WAIC — World Artificial Intelligence Conference), якая ў ліпені адбылася ў Шанхаі. Каля трох тысяч чалавек узялі ўдзел у глабальным мерапрыемстве ў анлайн-рэжыме, пры гэтым амаль 200 гасцей асабіста прысутнічалі на месцы яго правядзення. Сёлета WAIC быў арганізаваны з выкарыстаннем «воблачных канферэнцый», прычым галаграфічныя праекцыі ўпершыню былі ўжытыя на канферэнцыі такога маштабу.

На шанхайскім саміце прагучаў шэраг адметных заяў. Як адзначыў дырэктар па інфармацыйных тэхналогіях Huawei Таа Цзінвэнь, даныя становяцца ўсё больш важнымі ў наш час. Ён заявіў, што гэта чацвёрты па значнасці рэсурс пасля мора, сушы і паветра. Huawei лічыць, што развіццё штучнага інтэлекту павінна яго значна ўзмацніць. Аб'ёмы проста ўражваюць — штучны інтэлект здольны да 2030 года зрабіць унёсак у глабальную эканоміку ў памеры 16 трыльёнаў долараў. Пра гэта заявіў падчас сусветнай канфэрэнцыі генеральны дырэктар кампаніі GSMA Ltd (міжнародная асацыяцыя аператараў мабільнай сувязі) Джон Хофман. Ён адзначыў, што да 2030 года AI, па прагнозах, можа стымуляваць рост лакальных эканомік да 26 працэнтаў.

Хай-тэк супраць віруса

Пандэмія COVID-19 не змяніла тэндэнцыю тэхналагічных перавтварэнняў, а, наадварот, паскорыла тэмпы змен у лічбавых тэхналогіях, адзначыў заснавальнік кітайскай кампаніі Alibaba, сустаршыня Групы высокага ўзроўню ААН па лічбавым супрацоўніцтве Джэк Ма, паведаміла інфарм-агенцтва «Сіньхуа». Легендарны бізнесмен зрабіў гэтую заяву, выступаючы ў выглядзе галаграмы на WAIC-2020. Ён нагадаў, што падчас леташняй канферэнцыі ўдзельнікі спрачаліся пра тое, што будзе з працаўладкаваннем, калі машыны заменяць людзей. Аднак цяпер работнікі імкнуцца чым хутчэй перакласці як мага больш сваіх абавязкаў на робатаў.

«Напрыклад, у сферы барацьбы з распаўсюджваннем віруса мы павінны прыкласці ўсе намаганні, каб праблемы вырашаліся з дапамогай машын, а не людзей», — адзначыў Джэк Ма. Паводле яго слоў, выкарыстанне адпаведнага алгарытму павысіла эфектыўнасць дыягностыкі каранавіруса. «Урачу звычайна патрабуецца ад 15 да 20 хвілін, каб вывучыць вынікі камп'ютарнай тамаграфіі пацыента з падазрэннем на заражэнне COVID-19. Машыне ж неабходна ўсяго 20 секунд для аналізу гэтых КТ-малюнкаў, што ў 60 разоў больш эфектыўна», — падкрэсліў Ма.

Стваральнік Alibaba адзначыў, што трэба хутка і загадзя рыхтавацца да тэхналагічных пераўтварэнняў, бо яны абапіраліся на лічбавыя тэхналогіі, каб выжыць падчас эпідэміі. Яны знайшлі прымяненне ў самых розных паўсядзённых справах — ад правядзення канферэнцый да наведвання ўрача. «Вірусу не патрэбна віза, ён не адрознівае нацыянальных меж, таму і тэхналогіі павінны быць бязмежнымі», — заявіў Джэк Ма.

Падчас WAIC стала вядома, што Паднябесная запусціла глабальную платформу для медыцынскіх даследаванняў з выкарыстаннем тэхналогій AI. Ініцыятарамі стварэння MedNet выступілі Кітайская акадэмія інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій і Шанхайскі ўніверсітэт Цзяатун. Праект засяродзіцца на даследаваннях па ўжыванні хай-тэку як у клінічнай медыцыне, так і ў грамадскай ахове здароўя, паведаміла дырэктар Кітайскай акадэміі інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій Лю До.

Аўтапілот без абмежаванняў

Генеральны дырэктар Tesla Inc Ілан Маск на WAIC-2020 заявіў, што амерыканскі вытворца электрамабіляў «вельмі блізкі» да дасягнення тэхналогіі аўтаномнага кіравання пятага ўзроўню, які прадугледжвае магчымасць руху па дарогах без удзелу кіроўцы.

Пра гэта паведаміла Reuters. «Я па-ранейшаму ўпэўнены, што сёлета ў нас будзе базавая функцыянальнасць для пятага ўзроўню аўтаномнасці», — сказаў Маск.

Усяго існуе пяць узроўняў, устаноўленых арганізацыяй SAE International. Зараз электрамабілі, якія выпускае Tesla, адносяцца да трэцяга — кіроўца можа цалкам перадаць кіраванне аўтапілоту, але пры гэтым павінен знаходзіцца на вадзіцельскім крэсле і трымаць рукі на рулі. Да чацвёртага ўзроўню адносяцца беспілотнікі, якія могуць ездзіць без кіроўцы, але толькі па размечанай трасе. Пяты ўзровень — гэта аўтапілот без якіх-небудзь абмежаванняў, якому, па сутнасці, не патрабуюцца ні кіроўца, ні органы кіравання, такія як руль і педалі.

Як вядома, аўтавытворцы і тэхналагічныя кампаніі, у тым ліку Alphabet Inc, Waymo і Uber Technologies, інвестуюць мільярды ў індустрыю аўтаномнага кіравання. Tesla напярадзе, і гэта прыносіць вынік — у ліпені кампанія стала самым дарагім аўтавытворцам: яе акцыі выраслі да рэкордных значэнняў, а рыначная капіталізацыя пераўзышла паказчык былога лідара Toyota Motors Corp.

Небяспека і шанц

Работа над штучным інтэлектам для аўтамабіляў Tesla паказала Маску, што чалавецтва ўжо набліжаецца да сітуацыі, калі штучны інтэлект будзе істотна разумнейшы, чым людзі. «Я думаю, што да гэтага менш за пяць гадоў», — прагназуе адзін з топ-пяцёркі Forbes. Выступаючы на WAIC-2019, ён абвясціў, што камп'ютары «перасягнуць людзей ва ўсіх адносінах», прадракаючы нават з'яўленне новай расы AI, якая можа прывесці чалавецтва да трэцяй сусветнай вайны. Маск выказвае думкі аб небяспецы штучнага інтэлекту як мінімум з 2014 года. Тады ён напісаў у Twitter, што чалавецтву трэба быць вельмі асцярожным з тэхналогіяй, якая «патэнцыйна больш небяспечная, чым ядзерная зброя». Выступаючы ў Масачусецкім тэхналагічным інстытуце, Маск казаў, што гэта можа быць самай істотнай пагрозай чалавецтву. У 2018-м ён адзначаў, што цяпер штучны інтэлект шмат у чым засяроджаны ў руках найбуйнейшых кампаній.

Машынны розум у будучыні можа стаць прычынай гібелі чалавечай цывілізацыі. Пра гэта ў 2017-м заявіў вядомы брытанскі навуковец Стывен Хокінг падчас відэаканферэнцыі ў Пекіне. «Развіццё штучнага інтэлекту можа стаць як найбольш пазітыўным, так і самым страшным фактарам для чалавецтва. Мы павінны ўсведамляць небяспеку, якую ён уяўляе», — падкрэсліў той.

Каб не ўвасобіць у жыццё самыя смелыя чаканні песімістаў ды не ператварыць свет у антыўтопію, у якой машыны кантралююць людзей, распрацоўшчыкі займаюцца пытаннямі этыкі штучнага інтэлекту. Свае правілы рэгулявання прапанавалі і ў Ватыкане. Папа Рымскі Францыск неаднаразова звяртаў увагу кампаній Крамянёвай даліны на тое, што тэхналогіі могуць прывесці да «новага варварства», пры якім закон наймацнейшага будзе пераважаць над прынцыпам агульнай дабрыні. У этычным кодэксе, які Ватыкан сімвалічна прадставіў у пачатку 2020-га, сцвярджаецца, што штучны інтэлект павінен паважаць прыватнае жыццё, выключаць магчымасць прадузятасці, а таксама гарантаваць выкананне правоў усіх людзей. Ватыканскі кодэкс падпісалі Microsoft і IBM — адны з лідараў у распрацоўцы такіх тэхналогій. Савет Еўропы па штучным інтэлекце (CAHAI) таксама займаецца пытаннем рэгулявання тэхналогіі. Яго прадстаўнікі падкрэсліваюць, што гэтая работа звязаная не з запаволеннем ці абмежаваннем прагрэсу, а з захаваннем усіх правоў чалавека ў эпоху ўсё большай і большай лічбавізацыі.

Тым часам у Фінляндыі запускаюць праект AuroraAI (Паўночнае ззянне) па стварэнні штучнага інтэлекту, які будзе дапамагаць прымаць рашэнні ў дзяржаўным кіраванні і грамадскім жыцці. Работы над AuroraAI стартавалі сёлета ў лютым, завяршыць іх плануецца ў 2022-м. «Паўночнае ззянне» будзе ўлічваць патрэбы як арганізацый, так і асобных грамадзян, аб'ядноўваючы іх у адзіную базу, і дапамагаць дзяржаўным чыноўнікам прымаць аптымальныя і найбольш аператыўныя рашэнні. Пры гэтым кожны грамадзянін будзе сам вырашаць, якую інфармацыю пра сябе ён даверыць клапатлівым камп'ютарам, а якія палічыць за лепшае ад іх схаваць. Вядома, чым больш даных будуць адкрытымі, тым больш эфектыўнае і хуткае будзе абслугоўванне. Па словах распрацоўшчыкаў, AuroraAI навучаюць на канкрэтных рэальных сітуацыях. Па сутнасці, у ідэале будзе створана гнуткая сетка сувязяў паміж грамадзянамі, камерцыйнымі арганізацыямі і дзяржаўнымі сацыяльнымі службамі. Што атрымаецца ў рэальнасці — пабачым. Чакаць засталося нядоўга.

Захар БУРАК.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», г. Минск, ул. Казинца И. П., д. 121А, комната 327**

Предмет аукциона
Месторасположение: г. Минск, ул. Корженевского, 14/7

Наименование (назначение)	Общ. пл.	Инвентарный. номер
Здание неустановленного назначения	261,8 кв. м	500/С-63924

Сведения о земельном участке: пл. **0,1560** га предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов иного назначения

Начальная цена с НДС 20 % – 204 928,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Предмет аукциона должен быть оплачен покупателем (претендентом на покупку) в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 13.03.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона: 13.08.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 11.08.2020 до 17.00** по указанному адресу

Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИЙ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

Комитетом государственного имущества Гродненского областного исполнительного комитета проводятся аукционы по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района

К ПРОДАЖЕ ПРЕДЛАГАЕТСЯ:

1) Здание бани с пристройкой по ул. Красноармейской, 44 в г. п. Россь Росского с/с Волковысского района.
Начальная цена предмета аукциона – 88 017 руб. 72 коп.
Размер задатка – 9 000 руб.

2) Здание казармы под склад с террасой по ул. Красноармейской, 47 в г. п. Россь Росского с/с Волковысского района.
Начальная цена предмета аукциона – 169 103 руб. 95 коп.
Размер задатка – 17 000 руб.

3) Здание нежилое КИС (СЛИК) около г. п. Россь Росского с/с Волковысского района.
Начальная цена предмета аукциона – 3 565 руб. 45 коп.
Размер задатка – 400 руб.

4) Здание СББ лаборатории с беседкой, мощением, ограждением, калиткой, здание СББ хранилища около г. п. Россь Росского с/с, 35, 35/1 Волковысского района.
Начальная цена предмета аукциона – 65 599 руб. 04 коп.
Размер задатка – 6 600 руб.

Аукцион состоится – **03.09.2020 г. в 12.00.**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **28.08.2020 г. до 17.00**.

Подробная информация по телефонам:
в городе Волковыске: 8 (01512) 4 50 25, 2 06 03.
в городе Гродно: 8 (0152) 62 39 11, 62 39 24, 62 39 23, 62 39 31
Дополнительная информация размещена на сайте: **https://au.nca.by**

УНП 500042135

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 1, г.Витебск»
(210026, г. Витебск, ул. Суворова, 16)
сообщает о том, что 29 июля 2020 года на внеочередном общем собрании акционеров принято решение о выплате дивидендов за первое полугодие 2020 года.

Сумма дивидендов за первое полугодие 2020 года составляет 331 104,84 рубля. Размер начисленных дивидендов на одну простую (обыкновенную) акцию составляет 0,073975873 рубля.

Дивиденды юридическому лицу выплачиваются путем перечисления на текущий (расчетный) счет до 22 августа 2020 года, физическим лицам выплачивается согласно пункту 7.2. протокола № 68 годового общего собрания акционеров от 25 марта 2020 года по итогам (результатам) 2020 года.

УНП 300000398

Закрытое акционерное общество «ЮНИМИТ» (222220, Республика Беларусь, Минская обл., Смолевичский район, Плисский сельсовет, 9/12 в районе поселка Октябрьский) сообщает, что директором ЗАО «ЮНИМИТ» 30.07.2020 принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг. Формирование реестра акционеров осуществляется на 30.07.2020.

УНП 690660279

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже в частную собственность гражданам Республики Беларусь земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

Организатор электронных торгов: Новопольский сельский исполнительный комитет, 222845, Минская область, Пуховичский район, Новопольский сельсовет, аг. Новополье, ул. Центральная, 21, +375 17 133 03 16, (13) 3 03 35.
Оператор электронной торговой площадки: ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».
Торги проводятся 11.07.2020 г. на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**
Время торгов устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме.

№ лота	Местонахождение земельного участка; кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Инженерная инфраструктура	Начальная цена лота, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Сумма затрат на организацию и проведение торгов, бел. руб.
1.	д. Подлядье, ул. Дружная, уч. № 1 624484006601000114	0,1442	Сети электроснабжения: запитать отпайкой от существующей сети 0,4 кВ, мощностью 7,5кВт. Водоснабжение: скважина	2754,22	275,42	1 814,41
2.	д. Шелеги, ул. Радужная, 4 624484008401000081	0,1271	Электроснабжение: запитать от существующих сетей ВЛ – 0,4 кВ. Водоснабжение: предусмотреть автономное водоснабжение (строительство шахтного колодца, бурение скважины)	2 480,00	248,00	1 319,06
3.	д. Шелеги, ул. Радужная, 4А 624484008401000082	0,1277	Электроснабжение: запитать от существующих сетей ВЛ – 0,4 кВ. Водоснабжение: предусмотреть автономное водоснабжение (строительство шахтного колодца, бурение скважины)	2 491,00	249,10	1 454,45
